ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 19 (4271)
Нядзеля, 24 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 83

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ — Партыя, кляса, краіна.
Р. ШЭЛІН — Два шляхі два вынікі... (4 стар.).
Пленум ЦК КП(б)Б выбраў першым сакратаром ЦК тав. ГІКАЛО. Адкрыўся XIV зьезд КП(б)Б.
Аб рабоце ЦК КП(б)Б — даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА на II Гомельскай партканфэрэнцыі (2 стар.).
— На партыйных канфэрэнцыях (3 стар.).
Склад кіруючых органаў Менскага гаркому КП(б)Б, выбраных II гарпартканфэрэнцыяй (4 стар.).
ПОЛЬШЧА. Польскі фашызм дэманстуе свае «дасягненьні» (4 стар.)

УЧОРА АДКРЫЎСЯ XIV ЗЬЕЗД КП(б)Б

Пад ленінскім сьцягам непрымірымай барацьбы на два фронты і прымірэнцтвам наперад да новых перамог па шляху будаўніцтва сацыялізму

ПАРТЫЯ, КЛЯСА, КРАІНА

«Дыктатура пралетарыяту, — пісаў Уладзімер Ільіч, — ёсьць упартая барацьба, крывавая і бяскроўная, гвалтоўная і мірная, ваенная і гаспадарчая, педагагічная і адміністратарская, супроць сіл і традыцый старога грамадзтва... Без партыі, жалезнай і загартаванай у барацьбе, без партыі, якая карыстаецца давер'ем усяго сумленнага ў данай клясе, без партыі, якая ўмее сачыць за настроям масы і ўплываць на іх, весьці з посьпехам такую барацьбу немагчыма». Наша партыя, верная заветам ленінізму, заўсёды была зьвязана тысячамі непарыўных і мацнейшых нітей з рабочай клясай.

Разам з масамі, на чале мас, наша партыя перажыла ў дні Кастрычніка, у баёх за пралетарскую дыктатуру. Разам з масамі, на чале мас наша партыя перамагла ў баёх за адбудаваньне народнай гаспадаркі пасьля голаду, блёкады і інтэрвэнцыі. Разам з масамі, на чале мас, наша партыя пабудавала фундамант сацыялістычнай эканомікі і пераможна ажыцьцяўляе пяцігодку за чатыры гады. Ва ўсёй сваёй барацьбе наша партыя карысталася бязьмежным давер'ем найпшырэйшых працоўных мас вялікай савецкай краіны. Ва ўсёй сваёй барацьбе наша партыя ўмела згуртоўваць вакол сябе пралетарыят і працоўнае сялянства, узбройваючы іх рэвалюцыйнай энэргіяй, энтузіязмам і цьвёрдай верай у перамогу сацыялізму. Ва ўсёй сваёй барацьбе наша партыя няўхільна выконвала ленінскі завет не адрывацца ад мас, быць заўсёды з імі, вучыцца ў мас і весьці іх па шляху сацыялістычнай рэвалюцыі. Ільіч заўсёды непрымірымна выкрываў «тых, хто імкнуўся высока ўзьнесьці на масы і вучыць іх па кніжках. Адсюль пястомная пропаведзь т. Леніна: вучыцца ў мас, асмысьліць іх дзеяньні, дакладна вывучаць практычны вопыт барацьбы мас. Вера ў творчыя сілы мас — гэта тая самая асаблівасьць у язэйнасьці Леніна, якая давала яму магчымасьць асмысьліць стыхію і накіраваць яе рух у рэчышча пралетарскай рэвалюцыі» (І. Сталін).

Перыяд падрыхтоўкі да XIV зьезду КП(б)Б і XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі з пігацкай сілай яшчэ раз паказаў наколькі **МОЦНА і НЕПАРЫЎНА** зьвязана наша партыя з рабочай клясай, наколькі непахісным і бязьмежным зьяўляецца давер'е партыі з боку самых шырокіх пралетарскіх і працоўных мас. Падрыхтоўку да зьезду вялі ня толькі партыйныя арганізацыі і ячэйкі. Падрыхтоўку вялі непасрэдна і рабочыя масы ва ўдарнічэрстве і гераічнай барацьбе за прамфінпляны і калгасьнікі ў барацьбе за выкананьне сваіх абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай. Заводы, фабрыкі, саўгасы, калгасы і машына-трактарныя станцыі з найвялікшым творчым запалам змагаліся за права на дылярт XIV зьезду КП(б)Б аб сваіх перамогах.

Ніколі яшчэ актыўнасьць рабочай клясы і мільённых працоўных мас не дасягала такой вышыні, такой нязьмернай сілы, як зараз у момант зьезду КП(б)Б і на парозе XVII канфэрэнцыі ленінскай партыі.

Адзін за адным рапартуюць тігапты сацыялістычнай індустрыі аб перавыкананьні сваіх вытворчых праграм. Круга ўзьнялі тэмпы работы Гомельмаш, «Большавік» і іншыя прадпрыемствы. Выканаў пяцігодку датэрміновa у гонар зьезду машына-будаўнічы завод «Пралетары». Вырасьлі новыя сотні гаспадарча-разрахункових брыгад і плянавых груп імя XIV зьезду КП(б)Б і XVII партканфэрэнцыі. Чыгуначнікі БССР разгортваюць масавы паход за большавіцкія тэмпы на транспарце. У рады КП(б)Б уступаюць лепшыя пралетары, праверэныя на практычнай барацьбе за пяцігодку. Перадавыя саўгасы, калгасы і МТС выкавалі і перавыкавалі свае багатоўчыя плыны.

І гэты магутны ўздым мас, гэта найвялікшая хваля творчай актыўнасьці з кожным днём набывае ўсё большую сілу, узьнімаецца на новую вышэйшую ступень.

Увесь пралетарыят БССР, усе працоўныя горача вітаюць XIV зьезд большавікоў Савецкай Беларусі. Увесь пралетарыят, усе працоўныя дэманструюць сваю адданасьць і давер'е партыі, сваю бадзёрую гатоўнасьць змагацца пад яе кіраўніцтвам за новыя перамогі сацыялістычнай будоўлі. Сіла нашай партыі ў тым, што яна ўмее «зьвязацца, зьлівіцца, па-ленінску сказаць, калі хочаце, зьлівіцца з самай шырокай масай працоўных, у першую галаву з пралетарскай, але таксама і з непралетарскай працоўнай масай» (Ленін).

Да свайго XIV зьезду КП(б)Б — верны атрад ленінскай партыі — прышла сталёвай большавіцкай каторгай, згуртаванай вакол Цэнтральнага Камітэту і яго правадыра тав. Сталіна. Наша партыя на ўсіх этапах пралетарскай рэвалюцыі непрымірыма змагалася супроць ухілаў ад генэральнай лініі, ад ленінізму. Партыя разграмыла трацкізм, гэты перадавы атрад міжнароднай контр-рэвалюцыі. Зруйнавана правая апазыцыя. Партыя з ленінскай непрымірымасьцю змагаецца супроць посьбітаў галоўнай небясьпекі — правых апартуністаў, гэтых апалёгентаў капіталістычнай рэстаўрацыі і супроць іх «левых» саюзьнікаў, супроць тыпова лібералізму. КП(б)Б як і ўся наша партыя вядзе непрымірымую барацьбу супроць ухілаў у нацыянальным пытаньні і прымірэнцтва да іх.

ЛЕНІНСКАЯ НЕПРЫМІРЫМАСЬЦЬ НАШАЙ ПАРТЫІ ПЕРАМАГЛА. Краіна Саветаў дасягнула найвялікшых сусьветна-гістарычных посьпехаў сацыялістычнай будоўлі. У тэзісах дакладу т. т. Молатава і Куйбышава на XVII партканфэрэнцыі з выключнай яснасьцю адлюстраваны гэтыя перамогі, заваяваныя партыяй пад кіраўніцтвам ЦК і тав. Сталіна ў барацьбе з апартуністамі.

У гэтай барацьбе ленінская партыя стварыла адзіную базу сацыялізму — буйную сацыялістычную індустрыю, базу для пераможнага завяршэньня рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

У гэтай барацьбе партыя атрымала рашаючыя перамогі ў справе будаўніцтва саўгасаў і калгасаў. Канчаткова пагарваны карэньні капіталізму на вёсцы. Бядняцка-серадняцкія масы сялянства — на баку сацыялізму. Абсалютная перавага ў сельска-гаспадарчай эканоміцы нашай краіны цяпер належыць сацыялістычнаму сэктару — саўгасам і калгасам.

У бязьлітасных баёх супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць прымірэнцаў ленінская партыя стварыла пралетарыяту для пераможнага выкананьня першай пяцігодкі за чатыры гады і разграміла клясавага ворага. **Гэтым самым наша партыя забясьпечыла перамогу сацыялізму.** Гэтым самым наша партыя і рабочая кляса шчыльна падыйшлі да ажыцьцяўленьня сусьветна-гістарычнай задачы—задачы канчатковай ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў і зьнішчэньня клясаў наогул. «Канфэрэнцыя лічыць, што асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю, і перамога над перажыткамі капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бесклясавага сацыялістычнага грамадзтва» (З тэзісаў т. т. Молатава і Куйбышава).

Савецкі Саюз і яго фарпост БССР знаходзяцца на крутым уздыме. Мільённыя масы пралетарыяту і ўсіх працоўных ідуць пад кіраўніцтвам партыі на новых перамог большавіцкай пяцігодкі, наперад да бесклясавай сацыялістычнай грамады.

Капіталістычны сьвет даромна прабуе вырвацца з жалезных кіпцюроў крызісу, які ахапіў усе без выключэньня буржуазныя дзяржавы. На выратаваньне паміраючага капіталізму мабілізуюцца ўсе сілы рэакцыі ад жандармаў і да сацыял-фашыстаў, ад Каўцкага і да містэра Троцкага. **Не дапамога. Нічога ня выйдзе.** Сусьветны пралетарыят пад кіраўніцтвам Камінтэрну зруйнуе і капіталізм і яго сацыял-фашысцкіх служак.

У ДНІ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б — ШЧЫЛЬНЕЙ РАДЫ ВАКОЛ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ! ВЫШЭЙ СЬЦЯГ ЛЕНІНІЗМУ! ВЫШЭЙ ТЭМП БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ ЗАКЛЮЧНАГА ГОДУ ПЛЯНУ ВЯЛІКІХ РАБОТ!

Пленум выбраў першым сакратаром ЦК КП(б) т. Гікало

Інфармацыйнае паведамленьне

УЧОРА, 23 СТУДЗЕНЯ, АДБЫЎСЯ VII ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б.

У СУВЯЗІ З АДКЛІКАНЬНЕМ ТАВ. ГЕЯ НА ІНШУЮ ПРАЦУ, ПЛЕНУМ ВЫЗВАЛІЎ ЯГО АД АБАВЯЗКАЎ ПЕРШАГА САКРАТАРА ЦК КП(б)Б.

ПЛЕНУМ АДНАГАЛОСНА ВЫБРАЎ ПЕРШЫМ САКРАТАРОМ ЦК КП(б)Б ТАВ. ГІКАЛО.

ПЛЕНУМ ЗАЦЬВЕРДЗІЎ ПРАЕКТ ПАРАДКУ ДНЯ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б.

НА ГЭТЫМ-ЖА ПЛЕНУМЕ ЗАЦЬВЕРДЖАНЫ Ў АСНОЎНЫМ ТЭЗІСЫ АБ ВЫНІКАХ РАБОТЫ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР ЗА 1931 ГОД І ПЭР СПЭКТЫВЫ НА 1932 ГОД І ТЭЗІСЫ ПА ДАКЛАДУ «ЗАДАЧЫ КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА».

Біяграфія тав. М. Ф. Гікало

Тав. ГІКАЛО Мікалай Фёдараў нарадзіўся ў 1897 годзе ў сям'і селяніна былой Хэрсонскай губэрні.

Па сканчэньні вайскова-фэльчэрскага вучылішча ў Тыфлісе ў 1914 годзе быў адпраўлен на Каўказкі фронт, дзе прабыў да 1917 году. На фронце, прымаючы ўдзел у рэвалюцыйна-салдацкіх арганізацыях, тав. Гікало ў 1917 годзе ўступае ў рады камуністычнай партыі большавікоў і выбіраецца першым старшынёю Грозьненскага савету рабочых, салдацкіх, казачых і сялянскіх дэпутатаў.

У 1918 годзе тав. Гікало назначаецца камандуючым чырвонагвардзейскімі часьцямі Грозьненскага раёну, дзе вядзе бесьперапынную барацьбу з белагвардзейскімі бандамі.

Пасьля заняцьця дзянікінцамі ў 1919 годзе Паўночнага Каўказу, тав. Гікало становіцца на чале чырвоных партызанскіх атрадаў Церскай вобласьці і Дагестану. Пасьля разгрому белых на Паўночным Каўказе ў 1920 годзе тав. Гікало назначаецца камандуючым войскамі і вайсковым камісарам Церска-Дагестанскіх вобласьцей. У 1921 годзе тав. Гікало становіцца на чале пэрсыдзкай Чырвонай арміі.

З 1922 году тав. Гікало пасьлядоўна займае рад важнейшых кіруючых пасад:

У 1922 годзе — сакратар Горскага абкому УсеКП(б), у 1924 годзе — член Паўночна-Усходняга бюро ЦК УсеКП(б) і загадчык агітпропу, у 1926 годзе — сакратар Паўночна-Каўказкага краёвому УсеКП(б). У 1927 годзе тав. Гікало, па назначэньні курсаў марксызму-ленінізму, назначаецца членам выканаўчай камісіі і загадчыкам арганізацыйнага аддзелу Сярэдня-Азіяцкага бюро ЦК УсеКП(б), а потым выбіраецца першым сакратаром ЦК КП(б) Узьбекстану.

У 1929 годзе тав. Гікало М. Ф., выбіраецца першым сакратаром ЦК КП(б) Азербайджану. У 1930 годзе назначаецца намесьнікам загадчыка арганадзелу ЦК УсеКП(б) і потым у 1931 годзе тав. Гікало выбіраецца сакратаром Маскоўскага гарадзкога камітэту УсеКП(б).

За балёвыя заслугі тав. Гікало ўзнагароджан ордэнам Чырвонага сьцягу і годнасьцю ганаровага чэкіста.

XIV зьезд КП(б)Б адкрыўся

Дзеньнік зьезду

7 гадзін. Усе месцы ў залі Дому Культуры заняты.

На трыбуне сакратар ЦК КП(б)Б **тав. Шаранговіч.**

— Учора скончылася 8 год са дня сьмерці вялікага правадыра пралетарскай рэвалюцыі, незабыўнага **Уладзімера Ільіча Леніна...** Пад гукі жалобнага маршу большавікі Беларусі—дэлегаты зьезду—ушаноўваюць памяць свайго правадыра і настаўніка.

— Ад імя ЦК КП(б)Б,—гаворыць тав. **Шаранговіч,**—дэлегатам XIV зьезду гарачае большавіцкае прывітаньне. Ад XIII да XIV зьезду нас адзяляе пераўлічча кароткі адрэзак часу. Гэты кароткі перыяд багаты зьместам праведзенай работы. У краіне сацыялізму за гэты перыяд адбылася сусьветна-гістарычнага значэньня эрухі. У краінах капіталу яшчэ больш паглыбіўся крызіс.

У нашай краіне ленінскае пытаньне «хто-каго» выкрацана ў карысьць сацыялізму як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы.

У СССР становіцца ў строй тоё новыя і новыя прамысловыя гіганты, няўхільна пашыраецца металургічная і вугальна-энэргетычная база.

СССР стала крайнай самага буйнога ў сьвеце землеробства. Саўгасам і калгасам зараз належыць вядучая роля ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

Ліквідавана беспрацоўе, яшчэ больш палепшана матэрыяльна-бытавое становішча рабочае клясы і працоўных мас.

Рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам партыі, завяршыла трэці год пяцігодкі з буйнымі посьпехамі на ўсіх фронтах будаўніцтва сацыялізму.

Іменна таму, што КП(б)Б няўхільна вяла работую клясу па шляху разгорнутага наступленьня сацыялізму на капіталістычныя элемэнты, што яна непрымірыма змагалася з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі і пасьлядоўна ажыцьцяўляла ленінскія прынцыпы нацыянальнай палітыкі — іменна таму мы пераможна завяршаем пяцігодку за чатыры гады.

Тэзісы дакладу тав. Молатава да XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі — гаворыць т. Шаранговіч—прадстаўляюць сабой дакумент выключнай важнасьці ня толькі для нашай далейшай работы, для партыі, для рабочай клясы СССР, але і для сусьветнага рэвалюцыйнага руху.

Задачы, што стаюць зараз перад намі, вялізныя. Яны заключаюцца ў тым, каб пераможна завяршыць першую пяцігодку, узьняць якасныя паказьнікі ўсёй работы. Трэба большавізаваць тэмпамі пасоўваць наперад вырашэньне цэнтральнай і рашаючай зараз у сельскай гаспадарцы задачы—арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Ажыцьцяўляючы гэтыя задачы, праводзячы палітыку міру, мы павінны павышаць абароназдольнасьць нашай краіны, быць заўсёды гатовымі даць адпор капіталістам, якія імкнуцца праз інтэрвэнцыю супроць СССР знайсьці выхад з эканамічнага крызісу.

КП(б)Б да свайго XIV зьезду прышла маналітнай калёнай, згуртаванай вакол ленінскага ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі тав. Сталіна.

Прамова тав. Шаранговіча перарываецца бурнымі, працяжнымі воплескамі.

* * *

— Найлучшая пажаданьні дэлегатаў,—гаворыць тав. Шаранговіч,—забясьпечвае правамацнасьць зьезду.

Пад гукі «Інтэрнацыяналу», бурныя воплескі дэлегатаў, **XIV зьезд большавікоў Беларусі абвяшчаецца адкрытым.**

Зьезд аднагучна прымае прапанову менскай, віцебскай, гомельскай, барысаўскай, бабруйскай і мазырскай дэлегацый аб колькасным і персанальным складзе кіруючых органаў.

У склад прэзыдыуму выбрана 65 чалавек, у сакратарыят—15 чал., мандатную камісію—15 чал. і рэдакцыйную калегію—17 чал.

Бурнымі воплескамі, якія перайшлі ў авацыю, зьезд сустрэў агалашэньне кандыдатуры першага сакратара ЦК КП(б)Б **тав. Гікало.**

Пад бурныя, працяжныя воплескі дэлегаты зьезду выбіраюць ганаровы прэзыдыум у складзе т. т. **Сталіна, Кагановіча, Молатава, Варашылава, Арджанікідзэ, Калініна, Касіора, Крава, Куйбышава, Рудзутака, Постышава, Андрэева, Гаморніка, Тэльмана, Ленскага і Корчыка.** Дэлегаты ўстаюць і палітаўзаюць бурную авацыю.

Пасьля зацьвярджэньня парадку дня зьезд заслухаў прывітаньне рабочых Гомельскага чыгуначнага вузла—**ударнікаў паравоза С-52.**

— Дэлегатам XIV зьезду КП(б)Б,—гаворыць **тав. Мельнікаў,**—ад рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў Гомельскага рабу большавіцкае прывітаньне.

— Ажыцьцяўляючы пэрэкцыны партыі аб адзіраўленьні транспарту, аб вывазе яго з вузкага месца, мы, камуністычная брыгада паравоза С-52, дабіліся высокіх паказальнікаў работы.

Эканомія апалу—25,23 тоны, ня было ні аднаго выпадку зрыву скарэнні, нагон у шуці—401 мінута—таварны паказальнікі ўдарнай работы.

Тав. Шостаў ад імя чырвонаармейскага, начальніцкага складу пагранатраду і ўнутраных войск ДПУ перадаў партыйнаму зьезду баявое чэкісцкае прывітаньне.

— Нашы часьці,—гаворыць тав. Шостаў,—пільна ахоўваюць савецкія межы. У рабоце па павышэньні вайсковай вывучкі, на ўдоеле ў выкананьні агульных задач гаспадарчага будаўніцтва мы шырока разьвіваем сацыялабарніцтва і ўдарніцтва.

— Мы запэўняем XIV зьезд, што часьці ДПУ, вернымі трэцыцкім КП стрэчнічкіх бояў на першым заклыку партыі гатовы крывёю абараняць межы краіны сацыялізму.

— Перад імі пастаўлена задача авалодаць тэхнікай... Як сымбаль барацьбы за рэалізацыю гэтай задачы тав. Шостаў ад імя пагранічнікаў прапануе зьезду тэлеграму.

Гучнымі воплескамі зьезд сустрэў прывітаньне прадстаўніка чырвоных зётнікаў.

— Начальніцкі і чырвонаармейскі склад авіябрыгады імя СНК,—гаворыць **тав. Левін,**—з посьпехам выконваюць задачу баявой падрыхтоўкі. Мы заняли першае месца ў акрузе. Заваяванае намі пярэдніцтва мы замацуем ударнай работай па выкананьні кантрольных лічбаў баявой падрыхтоўкі.

Слова для адказу на прывітаньне прадастаўляецца тав. **Галадзеду,** якога зьезд сустракае бурнымі воплескамі.

Рапарт чытаючых і пісарскага зьезду ў выглядзе апрацаванага ім зьезду плану пароваза—гэта паказальнік таго, што работы чытаючых зразумелі дырэктывы партыі і ўдарна змагаюцца за іх рэалізацыю. Гэта гарантуе нам перамогу ў лічэнным пункта месца на часовейшым вучастку народнай гаспадаркі.

— Нас віталі чэкісты — пралетаўнікі ўзброенага атраду нашай партыі. Работу ДПУ нельга адарваць ад нашай агульнай работы і ў гэтым азначаецца тая вялікая розьніца, якая існуе паміж арміяй пралетарыяту і арміяй капіталістычных краін. Чэкісты — меч Кастрычніцкай рэвалюцыі. Дазвольце выказаць упэўненасьць, што ДПУ і далей з гонарам будзе выконваць задачы, ускладзеныя на яе пралетарскай дзяржавай.

Адным з найвялікшых нашых посьпехаў зьяўляецца той факт, што мы сьмела можам супроцьпаставіць пралетарскі самалёт — самалёту капіталістычнаму. Ні адна авіяцыя ня можа параўнацца з намі ў галіне баявой вывучкі лётнага складу.

— Мы павінны быць гатовымі ў патрэбную хвіліну даць адпор і панесьці руйнуючы, сьмяротны ўдар па ворагах пралетарыяту.

* * *

Зьезд аднадушна ўхваліў прапанову аб пасылцы прывітальных тэлеграм **ЦК УсеКП(б), тав. Сталіну, «Праўдзе», т. Варашылаву, Камінтэрну, ЦК камуністычнай партыі Польшчы, ЦК камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і партарганізацыям Масквы, Ленінграду і Заходняй вобласьці.**

* * *

На гэтым закончылася работа першага пасяджэньня XIV зьезду КП(б)Б.

Сёньня раніцою ў парадку дня зьезду—справаздачны даклад т. Шаранговіча аб рабоце Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.

Кіруючыя органы XIV зьезду КП(б)Б

Прэзыдыум

1. Абніцкі
2. Арапштам
3. Балцін
4. Баран
5. Бэнэк
6. Валкові
7. Валодзька
8. Вайчук
9. Владыкін
10. Галадзед
11. Гантман
12. Грысевіч
13. Гуровіч
14. Гей
15. Генкін
16. Гікало
17. Дамброўскі
18. Жуковіч
19. Жыдкоў
20. Іваноў
21. Іофэ
22. Кавальчук
23. Казлоўскі
24. Калнін
25. Калодка
26. Капавалаў
27. Капэльсон
28. Конг
29. Кузьелька
30. Купісак
31. Ластобран
32. Лаўроў
33. Ляўкоў
34. Малашонак
35. Матсон
36. Масюкоў
37. Міцькоў
38. Палякоў
39. Платун
40. Пыжыкаў
41. Рачыцкі
42. Рыжкоў
43. Рысюкін
44. Сафронава
45. Сосюкін
46. Судакоў
47. Суханава
48. Сямёнаў
49. Тамашэўскі
50. Тарасьвіч
51. Турмай
52. Убарэвіч
53. Хаўкін
54. Хашкевіч А.
55. Хашкевіч
56. Хлеўнікаў
57. Чарвякоў
58. Чарнушевіч
59. Чарвяцоў
60. Чадрын
61. Шаранговіч
62. Шафран
63. Шоламаў
64. Шэхтараў
65. Шыгальніц.

Сакратарыят

1. Бутар
2. Гарчэвіч
3. Гарын
4. Горын
5. Гніляковіч
6. Глезэраў
7. Дукельскі
8. Карбоўскі
9. Кіштымаў
10. Крылец
11. Кухаркін
12. Мазур
13. Рыліцкі
14. Шэнк
15. Хоцкін

Мандатная камісія

1. Барысевіч
2. Васільлева
3. Вайсэль
4. Гуровіч Л.
5. Кавалёў
6. Казакаў
7. Клімчук
8. Купросў
9. Лакцієнкоў
10. Палякоўскі
11. Рывінскі
12. Рэзыніцаў
13. Рубін
14. Чарнабыльскі
15. Яўсеенка

Рэдакцыйная камісія

1. Анцаровіч
2. Бацманаў
3. Грыцкевіч
4. Давідовіч
5. Дунец
6. Золатухін
7. Іванаў
8. Клімковіч
9. Курцін
10. Лабадаў
11. Лісковіч
12. Мітоін
13. Міхайлаў
14. Рубінштэйн
15. Сасевіч
16. Скараход
17. Фрункін.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЗЬЕЗДУ

Дзьве брыгады кантонскіх войск перайшлі на бок Чырвонай арміі

ШАНХАЙ, 23. Дзьве брыгады ўрадавых войск, размешчаных уздоўж Пэйпін-Ханькоўскай чыгункі ў 30 мілях ад Ханькоў, пад камандай генэрала Ці Мін-чжуна пакінулі і перайшлі на бок кітайскай чырвонай арміі.

ШАНХАЙ, 23. З Кантону паведамляюць, што камуністы сваёй адказілі актыўнасьць у паўночных і ўсходніх раёнах Гуангчоўскай провінцыі і ўзмоцнілі тэрор Пашкі і Фушкіна. Супроць камуністаў будзе кінута 120-тысячная армія генэрала Чжэ Цзі-шана.

АБ РАБОЦЕ ЦК КП(б)Б

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча на II Гомельскай партканфэрэнцыі*)

IV. Даб'емся далейшага паляпшэньня матар'яльна бытавога становішча рабочых

На падставе агульнага росту народнай гаспадаркі мы маем дадзеныя значныя зрухі ў галіне паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочай класы, прычым посьпехі ў разьвіцьці народнай гаспадаркі даюць нам магчымасьць дабіцца яшчэ значна большага паляпшэньня матар'яльна-бытавога становішча рабочых. Тав. Сталін у гэтым пытаньні сказаў наступнае:

«Трэба зразумець, што ўмовы існаваньня рабочага зьмяніліся ў нас у корані. Рабочы зараз ня той, што раней. Цяперашні рабочы, наш савецкі рабочы, хоча жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэб і ў сэнсе харчаваньня, снабжэньня, і ў сэнсе жыльлёвых, і ў сэнсе забесьпячэньня культурных і усякіх іншых патрэб. Ён мае на гэта права і мы абавязаны яму забясьпечыць гэтыя ўмовы» (Сталін).

Выконваючы гэта ўказаньне тав. Сталіна, мы маем значны зрух у галіне павышэньня заработнай платы, жыльлёвага будаўніцтва і ў рабоце, зьвязанай з перабудовай спажывецкай каапэрацыі і паляпшэньнем гандлю. Вы ведаеце, з якою ўвагай ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б займаюцца пытаньнямі, зьвязанымі з перабудовай нашай каапэрацыі, з рашучым паляпшэньнем грамадзкага харчаваньня, перабудовай нашага гандлю. Вы ведаеце, гаксама, што партыя паставіла задачу — рашуча перабудаваць нашу камунальную гаспадарку і ліквідаваць яе адставаньне ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. У сувязі з гэтым мы маем пастановы пленуму ЦК аб перабудове камунальнай гаспадаркі ў сталіцы СССР — Маскве, пастановы ЦК аб камунальнай гаспадарцы Ленінграду і Ніжняга Ноўгораду. Ажыцьцяўляючы дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб камунальнай гаспадарцы, мы распрацавалі рад мерапрыемстваў, зьвязаных з рэканструкцыяй камунальнай гаспадаркі сталіцы БССР. — Менску. Такім чынам, 1932 год, як у сэнсе паляпшэньня работы нашай каапэрацыі і гандлю, так і ў справе рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі павінен быць годам рашучых зрухаў і ажыцьцяўленьня раду важнейшых практычных мерапрыемстваў.

Якія мы маем у гэтых пытаньнях асноўныя недахопы?

У галіне работы нашай тавараправоднай сеткі гандлёвых арганізацый мы маем: дрэнная плянаваньне, пляны і разнарадкі тавараў складаюцца без улику, часамі без запаведнай яўлянасьці тавараў. Бываюць выпадкі, што ў той раён, дзе ёсьць лішкі тавараў, завозяцца новыя тавары, а ў тыя раёны, дзе іх няма, нічога не завозіцца. Прадпрыемствы, якія выконваюць прамфінплян, часта не карыстаюцца нізкімі перавагамі. Нават фонды для ўларнікаў у трэцім квартале разьмяркоўваліся не ў залежнасьці ад колькасьці ўдарнікаў і не перабудовы.

V. У барацьбе за няўхільнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі

Тыя агульныя дасягненьні, якія мы маем і ў галіне прамысловасьці, і ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочых, зьвязаныя з дасягненьнямі і ў ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі. КП(б)Б за справаздачны час у рашучай барацьбе з фактамі скажэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, з вялікадзяржаўным ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з мясцовымі павінізмамі, дабіўся значных посьпехаў. Вы ведаеце, што нацыянальнае пытаньне некаторая частка таварышоў разумее і зводзіць толькі да пытаньняў культурніцтва. Гэта азначае недаацэнку нацыянальнага пытаньня і неразуменьне яго сутнасьці.

Будуючы новы завод, саўгас, калгас, ажыцьцяўляючы задачы, зьвязаныя з перабудовай транспарту і г. д., мы на справе вырашаем і ажыцьцяўляем ленінскую нацыянальную палітыку.

У справе вырашэньня задач культурнай рэвалюцыі, КП(б)Б мае значныя посьпехі. БССР першая з усіх нацыянальных рэспублік узяла ўсеагульнае навучаньне. Мы мелі ў нас раней 70 проц. нацыянальных, а зараз мы ставім задачу, каб у 1932 г. абвясьціць БССР краінай сусьветнай пісьменнасьці. Такія гарады, як Гомель, ужо ў асноўным выканалі гэту задачу. Мы маем значны рост вышэйшых навучальных устаноў. Калі іх зусім ня было ў нас да рэвалюцыі, дык зараз мы маем 26 вышэйшых навучальных устаноў, 88 тэхнікумаў.

Расьце і разьвіваецца дзеяньне Кастрычніцкай рэвалюцыі, якое мае вялікае значэньне ў ажыцьцяўленьні задач культурнай рэвалюцыі, задач нацыянальнай палітыкі — Акадэмія Навук, інстытут гісторыі партыі.

Расьце пралетарская літаратура на беларускай мове і на мовах нацыянальнасьцей. Мы маем значны зрух у нашай выдавецкай справе, у рабоце па забесьпячэньні літаратурай на мовах нацыянальнасьцей. Мы маем, парадзе, значны якасны і колькасны рост усіх зьвеньняў друку, значныя посьпехі ў справе разгортваньня і перабудовы рабселькораўскага руху. Мы маем 13 цэнтральных газэт, з іх 7 газэт на беларускай мове, адну на польскай, 3 на яўрэйскай, 1 на расійскай, 1 на літоўскай. Мы маем 62 рабочых друкаваных газэты і 60 фабрычна-заводзкіх друкаваных шматтыражак. Спаравалачны час характарны значным узмацненьнем кіраўніцтва друкам і рабселькораўскім рухам як з боку ЦК КП(б)Б, так і з боку раённых партыйных камітэтаў.

Усе гэтыя асноўныя дасягненьні сьведчаць аб тым, што мы з посьпехам разьвіваем культуру нацыянальную па форме і сацыялістычную па сваім зьмесьце.

Таварышы! Усе гэтыя посьпехі ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва, як і далейшыя задачы, якія перад намі стаяць у гэтай галіне, павінны быць і былі непарыўна зьвязаны з барацьбой за правільнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. КП(б)Б правяла вялікую работу па выкрыцьці контр-рэвалюцыйнай беларускай нацдэмаўшчыны і яе агентуры ўнутры партыі — нацыянал-апартуністаў.

Мы разгромілі і выкрылі ў вялікіх шырокіх мас контр-рэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм. Мы адначасова выкрылі ўнутры партыйнай арганізацыі канкрэтных посьбітаў нацыянал-апартунізму і зрабілі рад адпаведных арганізацыйных вывадаў у дачыненьні да нацыянал-апартуністаў.

Вядучы рашучую барацьбу са скрытымі ленінскімі лініі партыі ў нацыянальным пытаньні, мы адначасова разгарнулі барацьбу з вялікадзяржаўным ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і канкрэтнымі яго посьбітамі.

Але адначасова трэба адзначыць, што ў ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, пры зусім правільнай агульнай лініі ў барацьбе з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і з нацыянал-апартунізмам у свой час (у 1929 г. і пачатку 1930 г., а таксама на XIII зьезьдзе КП(б)Б) былі дапушчаны памыляковыя пастановы.

Вы напэўна ўжо чыталі пастанову бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б аб выпраўленьні гэтых памыляковых пастаноў. Гэтыя памылкі заключаюцца ў тым, што ў радзе артыкулаў, зьмешчаных у кіруючым друку і перад гэтымі зацьверджаных ЦК у 1929 г. і ў пачатку 1930 г., а таксама на XIII зьезьдзе КП(б)Б на дакладу аб прафсаюзах, быў прынят памыляковы лёзунг адносна таго, што нацыянал-дэмакратызм зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, тады як X і XII зьезды РКП(б) ва ўсіх сваіх пастановах вызначалі, што галоўнай небясьпекай зьяўляецца ўхіл у бок вялікадзяржаўнага павінізму.

Памыляковасьць лёзунгу аб нацыянал-дэмакратызме, як галоўнай небясьпецы, якая зараз выпраўлена Цэнтральным Камітэтам партыі, не дае, аднак, і ня можа даць нікому падстаў рэвізаваць і браць пад сумненьне ўсю лінію КП(б)Б у пытаньнях правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, у пытаньнях барацьбы з нацыянал-апартунізмам і нацыянал-дэмакратызмам, якую КП(б)Б, пад кіраўніцтвам ЦК, правяла зусім правільна. І мы будзем самым рашучым чынам даваць адпор такім элементам, якія напрабуюць рэвізаваць усю лінію КП(б)Б у пытаньні барацьбы за нацыянальную палітыку партыі. ЦК КП(б)Б адразу пасьля XVI зьезду УсеКП(б) прыняў зусім правільную пастанову аб тым, што ўхіл у бок вялікадзяржаўнага павінізму зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе. Іменна на аснове гэтай установы мы працавалі ўвесь апошні час і дабіліся тых значных посьпехаў у вырашэньні нацыянальнай палітыкі, аб якіх я вам коратка вышэй сказаў. Наша задача заключаецца зараз у тым, каб мабілізуючы ўвагу ўсёй КП(б)Б на рашучае выкрыцьцё і барацьбу з вялікадзяржаўным ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, выкрываючы яго канкрэтных посьбітаў, даваць адначасова рашучы адпор і ўсякім іншым скрытым ленінам і адхіленьням ад ленінскай нацыянальнай палітыкі, даваць бязьлітасны адпор павінізмам усіх іншых веляцяў.

Мы за апошні час маем рад фактаў, якія сьведчаць аб актывізацыі вялікадзяржаўнага ўхілу.

Назаву толькі пару прыкладаў: пастаўлік яўрэйскай школы ў Жыткавічах Чудзін палаў заяву аб зьяўленьні яго з работы, што ён, бачыце, ня можа працаваць у Беларусі, дзе «шугчна праводзіцца беларусізацыя». У гэтай-жа заяве гэты марэц вялікадзяржаўны павініст піша «беларуская мова нежывая, ніхто на ёй не гаворыць... Усе школы як нацыянальныя, так і беларускія, трэба пакрысе русіфікаваць».

Мы мелі выступленьні Вальфорна, Выдры і іншых не з марксыцка-ленінскай пастаноўкай нацыянальнага пытаньня, а выступленьні з вялікадзяржаўных ухілістаў (супроцьстаўленьне нацыянальнай формы не зьместу, пагардзіньня адносны да «дробязей» нацыянальнай культуры і г. д.).

Над кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б рад перадавых пралетарскіх арганізацый правялі ўжо значную работу па мабілізацыі ўвагі на барацьбу з вялікадзяржаўным павінізмам. У тым ліку Менская, Гомельская, Віцебская і рад іншых партыйных арганізацый праводзяць рашучую барацьбу з адхіленьнямі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі. Мы ў свой час выкрылі і адзначылі ў пастанове ЦК КП(б)Б рад буйнейшых прарываў у ажыцьцяўленьні нацпалітыкі па Віцебскай партарганізацыі, і пасьля вымены кіраўніцтва новае кіраўніцтва прыняло рад крокаў для выкрыцьця скрытых ленінскіх лініі партыі ў нацыянальным пытаньні, барацьбы са скрытымі, разгортваньня рашучай барацьбы за нацыянальную палітыку партыі.

Разгортваючы рашучую барацьбу з вялікадзяржаўным ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, мы не павінны ні на адну хвіліну зьмяшчаць пільнасьці да прояўленьняў мясцовых павінізмаў (беларускі, яўрэйскі, польскі і інш.). Няправільна думаць, што мы ўжо канчаткова разгромілі нацдэмаў, што мы, пырока выкрыўшы ўсю іх контрэвалюцыйную сутнасьць, гарантаваны ад праяўленьняў нацдэмакратызму магчыма ў новых формах. Паколькі мы ня выкарчавалі яшчэ цалкам усіх рэштак капіталістычных элемэнтаў, паколькі існуюць клясы і клясавая барацьба, гэтыя праяўленьні будуць яшчэ мець месца, і ў далейшым мы не павінны ні ў якім разе аслабляць барацьбы з ухілами ў бок мясцовага шавінізму.

VI. З усёй сілай і рашучасьцю — за вырашэньне праблемы падрыхтоўкі кадраў

З барацьбой за нацыянальную палітыку партыі, як і з іншымі агульнымі задачамі нашай партыі шчыльна зьвязана праблема кадраў.

XVI зьезд УсеКП(б) падкрэсьліў, што «толькі пры далейшай мабілізацыі сіл усёй партыі і рабочай клясы вакол задачы падрыхтоўкі кадраў з людзей рабочай клясы, толькі пры рашучым зруху ў гэтым абсягу можа быць забясьпечана далейшае правядзеньне бальшавіцкі тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны».

КП(б)Б у галіне вырашэньня праблемы кадраў прарабіла з часу свайго XIII зьезду значную работу. Вось некаторыя паказальнікі па гэтым пытаньні: буйнейшымі мерапрыемствамі ў справе вырашэньня праблемы кадраў зьявілася разгортваньня Беларускага дзяржаўнага ўніверсытэту і сельска-гаспадарчай акадэміі. На базе адпаведных факультэтаў БДУ і акадэміі створана 11 новых інстытутаў.

З існуючых 26 ВНУ ёсьць 7 вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў, 7 сельска-гаспадарчых ВНУ, 4 эканамічныя інстытуты, і медыцынскі інстытут. З часу XIII зьезду павялічылася сетка тэхнікумаў (адкрыты 52 новыя тэхнікумы).

Ёсьць значнае паляпшэньне сацыяльнага і нацыянальнага складу навучальных устаноў.

Пяцігадовы плян па колькасьці тэхнікумаў і студэнтаў перавыканан больш чым у два разы. Яркім паказальнікам павялічэньня ўвагі да праблемы кадраў зьяўляецца павялічэньне асигнаваньняў. Калі па пяцігодзьці меркавалася асигнаваньняў на падрыхтоўку кадраў у 1933 г. 19 млн., то ўжо ў 1931 годзе на падрыхтоўку кадраў было выдаткавана 53 млн. руб.

За мінулы перыяд праведзена вялікае разгортваньне сеткі школ фабрычна-заводзкага і саўгаснага вучнёўства, якія становяцца асноўнай крыніцай папаўненьня прамысловасьці і сельскай гаспадаркі кваліфікаванымі рабочымі кадрамі. Пяцігадовы плян у гэтай галіне перавыканан больш чым у чатыры разы.

Такім чынам нашымі задачамі павінны быць:

Рашучая барацьба на два фронты ў нацыянальным пытаньні, барацьба з вялікадзяржаўным ухілам, як галоўнай небясьпекай, а таксама з мясцовымі ўхіламі і з усякімі скрытымі лініі партыі ў нацыянальным пытаньні.

Рашучае ўзмацненьне работы па беларусізацыі ўсяго апарату; адначасова большае ўкараненьне беларускай мовы сярод рабочых, разгортваючы гэту работу на добраахвотных падставах; не абмяжоўваюцца толькі вывучэньнем беларускай мовы, дабіваюцца аўладаньня партарганізацыямі і рабочай клясай усімі працесамі нацыянальна-культурнага будаўніцтва, узмацненьня інтэрнацыяналізацыі нашых прадпрыемстваў, разгортваньня далейшай работы сярод працоўных нацменшасьцей.

Далейшае разгортваньне культурнага будаўніцтва — гэта значыць узмацніць кіраўніцтва школамі, ліквідацыяй няпісьменнасьці. Неабходна ўзмацніць кіраўніцтва Беларускай Акадэміяй Навук, узьняўшы яе на большую вышыню, як навуковы цэнтр Беларусі, узмацніць кіраўніцтва інстытутам гісторыі партыі. Неабходна дабіцца хутчэйшага выпуску ленінскіх зборнікаў, узмацніць партыйнае кіраўніцтва на фронце пралетар. кай літаратуры, мастацтва, кіно, тэарытычным фронце, усім культурным фронтам, падцягнуць яго да чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Трэба разам з тым адзначыць цяжкае становішча раду школ ФЗВ і саўгасвучаў у сувязі з адсутнасьцю інтэрнатаў, абсталяваньня, мэтадычнага і агульнага кіраўніцтва імі з боку адпаведных ведамстваў.

Пры ўсіх гэтых дасягненьнях у галіне падрыхтоўкі кадраў мы адначасова павінны сканцэнтраваць увагу на зьвяшчэньні раду буйнейшых прарываў, якія, галоўным чынам, датычаць якасьці работы нашых навучальных устаноў і якасьці падрыхтоўкі нашых пралетарскіх кадраў. Мы ў Беларусі стварылі шырокую сетку вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў. Аднак, да гэтага часу на сутнасьці ўся партыйная арганізацыя яшчэ слаба займалася пытаньнямі якасьці работы, забесьпячэньнем падвядзеньня матар'яльнай базы над вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы. Вось на гэту галіну мы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Апрача падрыхтоўкі кадраў праз нашы навучальныя ўстановы, мы павінны разгарнуць шырокую падрыхтоўку кадраў (праз курсы і іншыя формы) непасрэдна ў раёнах, на прадпрыемствах, у саўгасах, буйнейшых калгасах. Мы павінны стварыць аўтарытэтны і моцны апарат па кадрах на прадпрыемствах і ўстановах, у сувязі з гэтым паставіўшы на належную вышыню падрыхтоўку рэзэрвовых кадраў. Больш трэба вывучаць кадры і высоўваць іх зьнізу. Гэта асабліва датычыць нашых партыйных арганізацый у вёсцы.

Я хачу закрануць наступнае пытаньне: некаторыя таварышы з вясковых арганізацый думаюць, што мы будзем бязупынна пасьлядоўна у вясковым партыйным арганізацыі з гэраду кадры для падмацаваньня вясковай арганізацыі. Бязумоўна, мы адмаўляцца ад гэтага ня будзем, і рад раёнаў будзем асабліва падмацоўваць кадрамі. Аднак, вясковым арганізацыям трэба галоўнай націск зрабіць на тое, каб высоўваць і выхоўваць новыя кадры зьнізу, а масы калгаснікаў і рабочых саўгасаў, падрыхтоўваючы з іх кіраўнікоў сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

VII. Аб рабоце масавых арганізацый пралетарыяту

За мінулы адрэзак часу партыя наша расла і яшчэ больш на-бальшавіцку загартоўвалася. Разам з гэтым мы маем рост і ўзмацненьне «прывалных мас» ад партыі да мас. Новыя ўмовы патрабавалі перабудовы работы ўсіх масавых арганізацый пралетарыяту. За час з XIII зьезду КП(б)Б у гэтых адносінах ёсьць яўныя зрухі і паляпшэньне работы масавых арганізацый. Я ня буду падрабязна спыняцца на рабоце ўсіх масавых арганізацый з тым, каб сказаць толькі аб рабоце асноўных арганізацый.

За гэты час мы дасягнулі значных вынікаў у галіне перабудовы работы прафсаюзаў, праведзена вялікае ачышчэньне прафапарату ад апартуністычных і бюракратычных элемэнтаў. Перад прафсаюзамі пасьля XVI-га зьезду УсеКП(б) стаяла асноўная задача — павярнуцца тварам да вытворчасьці і заняцца канкрэтнымі вытворчымі заданьнямі. Вядомае вам усім разбуйненьне прафсаюзаў значна спрыяла выкананьню гэтай асноўнай задачы і дало свае станоўчыя вынікі.

Мы зараз маем 29 саюзаў пасьля перабудовы, замест існаваўшых раней у БССР 21 саюзу. Ва ўсіх раёнах створаны райпрафсаветы. Праработка паглыбілася да пізавога вытворчага зьвяна. Створан цэлы рад новых форм работы (зьвеніпрафкомы, групавыя і брыгадныя прафорганы, брыгадныя і групавыя вытворчыя нарады, стварэньне добраахвотніцкага прафсаюзнага актыву і інш.).

Шырокае разгортваньне самапасьборніцтва і ўдарніцтва і далейшае паглыбленьне яго форм і канкрэтызацыя праходзілі пры актыўным удзеле прафсаюзу. Мы маем зараз такое становішча, калі ахоп самапасборніцтвам і ўдарніцтвам з 46 проц. у сярэдзіне 1930 г. узьняўся прыблізна да 70 проц. На асноўных прадпрыемствах набылі шырокае разгортваньне такія формы самапасборніцтва, як сустрэчныя прамфінпляны, «сквозные» брыгады, сацыялістычны канвэер па якасьці, плянава-апаратныя групы, гаспадарча-разьлікавыя брыгады і інш. формы.

Аднак, усё гэта яшчэ не азначае таго, што прафсаюзы заваяваны ўжо сваю перабудову і што зараз становішча перабудовы прафработы знаходзіцца на належным узроўні. Гэта ня так. Мы яшчэ маем у рабоце прафсаюзаў рад істотных недахопаў. Ня ўсюды перабудова работы прайшла па сутнасьці. Яшчэ шмат у гэтай справе фармалізму і казёншчыны. Прафсаюзамі яшчэ зроблена далёка ня ўсё ў галіне разгортваньня і паляпшэньня якасьці самапасборніцтва і ўдарніцтва. Да ліку недахопаў работы прафсаюзаў трэба яшчэ аднесьці слабы ахоп прафсаюзамі рабочых. Процант ахопу працоўных прафсаюзамі з 82,8 проц. на 1-X 1928 г. зьнізіўся да 71,7 на 1-IV 1931 г. Такім чынам, перад прафсаюзамі паўстае цэлы рад важнейшых задач, якія павінны зьвязаць на яшчэ большую вышыню ролю прафсаюзаў, як школы камунізму.

За мінулы адрэзак часу дасягнуты вынікі станоўчага парадку і ў галіне работы сярод працоўных жанчын. Укараненьне жаночай працы ў прамысловасьць дае ўвесь час павышэньне. Так, напрыклад, калі сярод рабочых цапавай прамысловасьці на 1.I 1929 г. налічвалася 31,4 проц. жанчын, дык на 1-I 1931 г. гэты процант узьнімецца на 35,8 і на 1-VII 1931 г — 36,7. Работніцы прымаюць актыўны ўдзел у самапасборніцтве і ўдарніцтве, займаючы сярод ударнікаў амаль палову.

Бязумоўна, мы маем дасягненьні і ў галіне разгортваньня работы сярод калгасніц. Нядаўна мы правялі ўсебеларускі зьезд калгасніц, які ярка паказаў вялізарны рост актыўнасьці калгасніц. Наша работа сярод калгасніц адстае ад іх росту і задач калгаснага будаўніцтва на сучасным этапе. Гэты буйны падалок усёй нашай далейшай работай трэба выправіць.

Нашай далейшай задачай зьвяцца яшчэ больш узмацніць работу сярод працоўных жанчын і зрабіць гэта справай усіх партыйных арганізацый, кожнай партыйнай ячэйкі.

Камсамольская арганізацыя таксама падыходзіць да XIV зьезду КП(б)Б з буйнейшымі дасягненьнямі ў сваёй рабоце. Мы за гэты час мелі бурны рост камсамолу. Даволі сказаць, што ЛКСМБ з часу свайго X зьезду вырас на 90 тыс. з лішкам чалавек. Павысілася ўдзельная вага і роля камсамолу на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, таварышы, у камсамоле мы яшчэ маем рад буйнейшых недахопаў, галоўныя з якіх заключаюцца ў слабасьці выхаваўчай работы сярод камсамольцаў і працоўнай моладзі. Можна прывесьці рад фактаў, якія сьведчаць аб тым, што камсамольцы шрымаюць слабы ўдзел у рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, што ды зьяўляюцца прыкладам для ўсёй масы рабочых і г. д.

Аднак, у гэтых недахопах ёсьць доля віны і нашых партыйных арганізацый, якія яшчэ не забясьпечылі штодзённага партыйнага кіраўніцтва камсамолам і пытаньням работы камсамольскай арганізацыі, замяняюцца ад выпадку да выпадку.

Камсамол надалей павінен перад сабой паставіць задачу — узмацніць марксыцка-ленінскае выхаваньне сваіх радоў, больш і лепш рыхтаваць кадры, якіх нам так многа патрабуецца на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба не фарсаваць рост камсамолу, а разгарнуць паглыбленую работу з новымі кадрамі камсамольцаў і на гэту справу накіраваць галоўную ўвагу.

Трэба ўзмацніць марксыцка-ленінскае выхаваньне камсамольскага актыву, лепш забясьпечыць кадрамі актыву яго вясковыя арганізацыі, узмацніць канкрэтнае і штодзённае партыйнае кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй, яшчэ вышэй узьняць ролю і месца камсамолу ў барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва.

Перад саветамі за гэты час паўстаў цэлы рад новых канкрэтных задач. Мы дабіваліся таго, каб сапраўды павярнуць гарсаветы тварам да вытворчасьці і сельскія саветы тварам да калгаснага руху. Трэба сказаць, што ў гэтых адносінах мы дабіліся немалых результатаў. У рабоце гарсаветаў затрымала шырокае распаўсюджаньне такая новая форма ўдзельнасьці працоўных мас, як дэпутацкія групы на прадпрыемствах.

Вы ведаеце, што асобныя сельсаветы былі ў сваёй некаторай частцы засьмечаны кулацка-варожымі элемэнтамі. У мінулыя перавыбары сельскіх саветаў мы значна ачысьціліся ад апартуністычных і кулацкіх элемэнтаў. Сельсаветы пачалі больш, але праўда, яшчэ невыстарчальна, займацца пытаньнямі калгаснага будаўніцтва.

З усяго сказанага аб рабоце масавых арганізацый пралетарыяту трэба зрабіць вывад аб тым, што яны пачалі перабудову сваёй работы, але ў гэтых адносінах яшчэ далека ня ўсё зроблена. Перабудова работы масавых арганізацый павінна быць праведзена так, каб яна поўнасьцю адпавядала сучасным тэмпам і задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

VIII. Пад сьцягам Леніна — да далейшых перамог

Апошняе пытаньне, на якім я хачу спыніцца, гэта пытаньне аб партыі. Таварышы, я гавару аб тых умовах, у якіх мы жывем і працуем. Гэтыя ўмовы складаныя, яны прадпісываюць да нашай партыі, як да кіраўніка ўсім сацыялістычнага будаўніцтва, як і ва ўсёй панярэдняй рабоце, паказала, што яна зьяўляецца партыяй, якая пераможна вядзе савецкую краіну да канчатковай пабудовы сацыялізму. Аднак, таварышы, складаныя ўмовы, у якіх мы жывем і працуем, патрабуюць таго, каб мы яшчэ вышэй узьнялі выпрабаваны ў клясавых бойках ленінскі сьцяг нашай партыі ў кіраўніцтве масамі.

Тав. Кагановіч у сваім артыкуле: «Чарговыя задачы партыйнай работы і рэарганізацыя партапарату» гаварыў наступнае:

«...Калі веданьне тэорыі Маркса-Леніна давала магчымасьць з посьпехам весьці прапаганду камунізму ў перыяд падпольля; калі ўменьне па-рэвалюцыйнаму агітаваць масы ўцягвала масы на барацьбу з капіталізмам; калі адвага, сьмепасьць і самаадданасьць далі магчымасьць разьбіць контр-рэвалюцыйных генэралаў і інтэрвэнтаў у перыяд грамадзянскай вайны; калі ўменьне арганізаваць адміністраваць і сяк-так арыентавацца ў гаспадарчых пытаньнях давала магчымасьць адчуваць арыгінальную гаспадарку, то ў цяперашні перыяд рэканструкцыі, калі мы пранікаем у глыб, ва ўсе шчыліны, ва ўсе поры грамадзкага арганізму, калі мы перабудоўваем усе бакі грамадзкага мыцьця — гаспадарку, быт, культуру, калі мы будуем новыя гіганты на зусім новай тэхнічнай базе, калі культурнасьць мас, іх актыўнасьць, іх запатрабаваньні, матар'яльныя і духоўныя гіганцкі ўзрасьлі, — ад нас патрэбна ў галіне арганізацыі, агітацыі, прапаганды, арганізацыі гаспадаркі, кіраўніцтва культурнай падрыхтоўкай кадраў, значна больш гібкі і грунтоўны падыход, чым гэта было ў другія перыяды».

Мы, таварышы, якіх не павінны выпускаць з-пад увагі гэтых указаньняў т. Сталіна і т. Кагановіча. Партыя іх не выпускала з-пад увагі за мінулы перыяд, яна будзе кіраваць імі і ў далейшай сваёй рабоце.

Якія канкрэтныя даныя мы маем па лініі ўзмацненьня кіруючай ролі нашай партыі і ўплыву яе на масы?

Перш за ўсё аб гэтым сьведчыць рост партыі. Гэта зьяўляецца лепшым доказам таго, што рабочыя і асноўныя сялянскія масы ўсё больш згуртоўваюцца вакол партыі, цалкам даверачы ёй. Напрыклад, калі УсеКП(б) у 1917 годзе налічвала 23.600 членаў партыі, то ў 1930 г. — 1.562.161, на 1 лістада 1931 г. — 2.457.324.

КП(б)Б у сваіх радох да перыяду XII зьезду налічвала 35.398 членаў партыі, зараз — 54.392 члены партыі. Мы маем рост прытоку ў партыю рабочых, асабліва на апошні перыяд, значна паялічыў ся рост за кошт рабочых саўгасаў і калгасьнікаў, з чым зьвязана далейшае ўзмацненьне нашых партыйных арганізацый на вёсны.

Па сацыяльных складах КП(б)Б мае такі малюнак: рабочых — 40 проц., калгасьнікаў — 14 проц., служачых — 31 проц. і іншых — 12,8 проц.

Аднак, трэба падкрэсьліць, што, на гледзячы на рост партыі, які павялічыўся за лік рабочых, у адносінах да агульнага прыёму ў партыю мы маем зьніжэньне прыёму рабочых ад варштату. І гэта тлумачыцца тым, што рад вожчых пралетарскіх арганізацый на выконваюць дырэктывы ЦК адносна забесьпячэньня вызначанага процанту прыёму рабочых у партыю. Калі ўзяць нашы асноўныя пралетарскія арганізацыі, як Менск, Віцебск, Гомель, якія павінны былі б прымаць 95 проц. рабочых непасрэдна з вытворчасьці, то яны выкавалі гэта толькі на 83,2 проц.

Іншыя гарадзкія арганізацыі, якія павінны былі мець у прыёме 80 проц. рабочых, выканалі ў 1930 г. толькі 71,6 проц., у 1931 г. — 76,9 проц. Мы маем і адставаньне росту партыйнай праслойкі на прадпрыемствах і чыгуначным транспарце ад агульных тэмпаў прыёму фабрычна-заводзкіх рабочых.

На 1-I 30 г. партпраслойка сярод фабрычна-заводзкіх рабочых складала 19,2 проц., на 1-I 31 г. — 13,8 проц. і на 1-VII 31 г. — 13,1 проц.

Даныя аб 20 больш буйных прадпрыемствах паказваюць, што партпраслойка за два гады (ад 1-X 29 г. па 1-X 30 г.) зьнізілася ад 19,4 проц. да 16,4 проц.; пры гэтым на радзе прадпрыемстваў наваг зьменшылася абсалютная колькасьць камуністаў (шэйная «Прафінтэрн» — на 11 проц., папяровая «Спартак» — на 12,3 проц., льнапрадзальная імя К. Маркса — на 33,4 проц., фанэрны «Чырвоны Кастрычнік» — на 19,2 проц., гута «Каміньтэрн» — на 56 проц., імя Ланцуцкага — на 6,2 проц.).

За мінулы перыяд, побач са значным ростам партыйнай арганізацыі, мы мелі адначасова значнае паляпшэньне сацыяльнага складу і партыйнага стажу нашых кіруючых органаў — гаркомаў, райкомаў і бюро ячэек. Такое-ж паляпшэньне ёсьць і па нацыянальным складзе.

Справаздачны перыяд адпачаецца перабудовай і ростам пізавой партыйнай сеткі з перанясеньнем цэнтру работы ў пізавое зьвяно — цэх, агрэгат, зьмену. Паляпшэньне ў гэтых адносінах мы маем і ў вясковай арганізацыі — значны рост саўгасных і калгасных ячэек, перарост саўгасаў, буйных калгасаў і МТС у апорныя пункты партпработы ў вёсцы — значна ўзмацніла нашу партработу ў вёсцы. Такім чынам, мы маем бязумоўнае ўмацаваньне партарганізацыі ў вёсцы.

За гэты час мы правялі вялікую работу па перабудове партыйнага апарату як самога ЦК па прынцыпе наближэньня канкрэтнага кіраўніцтва і канкрэтнай дапамогі раёнам і ўстанаўленьня спецыялізацыі ў кіраўніцтве, у сувязі з гэтым стварылі рад новых сэктароў: прамысловы, жывёлагадоўчы, льняны, тарфяны, лясны і інш. У райкомах партыі мы склалі арганізацыйна-інструктарскія групы для непасрэднай дапамогі партыйным ячэйкам.

Аднак, ня гледзячы на гэтыя посьпехі ў перабудове партапарату, агульныя тэмпы перабудовы нашай партыйнай работы зьяўляюцца яшчэ невыстарчальнымі, прычым гэта асабліва адносіцца да раду буйнейшых прадпрыемстваў. Там, дзе мы маем прарывы ў выкананьні прамфінпляну, у выкананьні заданьняў партыі па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, там гэта, як правіла, зьвязана з новыстарчальнай перабудовай партыйнай работы, з нездавальняючым не наближэньнем непасрэдна да вытворчасьці.

ЦК УсеКП(б) заслухоўваў даклад ЦК КП(б)Б па пытаньнях перабудовы партыйнага апарату. У сваёй пастанове ЦК УсеКП(б) даў нам рад указаньняў аб узмацненьні тэмпаў перабудовы партыйна-масавай работы, аб умацаваньні кіраўніцтва масавымі арганізацыямі (прафсаюзамі, саветамі, камсамолам, жанчынамі і г. д.). Выконваючы гэтыя дырэктывы, мы павінны значна павысіць ролю партячэек у кіраўніцтве вытворчасьцю, асабліва ў вясковых партарганізацыях — у кіраўніцтве саўгасным і калгасным будаўніцтвам, у барацьбе за поўнае і сваўчасовае выкананьне заданьняў і г. д. Мы павінны значна павысіць авангардную ролю камуністаў, змагацца з усякімі хваснісцкімі элемэнтамі і настроямі ў радох нашых партыйных арганізацый, дабіваючыся таго, каб кожны камуніст у сучасны адказны перыяд зьяўляўся перадавіком.

Для павышэньня ролі ўсёй партыйнай арганізацыі для большага ідэйнага ўзбраеньня членаў партыі, для яшчэ лепшай мабілізацыі іх на выкананьне канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, партыя ў цэнтры ўвагі паставіла задачу марксыцка-ленінскага выхаваньня сваіх членаў. Гэта задача ў радзе пастаноў ЦК вызначана, як адна з важнейшых. Мы маем у гэтай справе пэўны зрух. Аднак, таварышы, трэба адзначыць, што ў выніку нашых абсьледаваньняў (напрыклад, Бабруйская партарганізацыі, Чачэрская, Лоеўская, Аршанскай, Жыткавіцкай і інш.) выявіўся цэлы рад фактаў неразуменьні справы марксыцка-ленінскага выхаваньня. Матар'ялы абсьледаваньня паказваюць, што рад арганізацый яшчэ не навучыліся ўвязваць задачы марксыцка-ленінскага выхаваньня з выкананьнем чарговых задач, якія стаяць перад імі на лініі заготавак і іншых важнейшых кампаній і галін нашай работы. Дрэнна стаіць справа з партвучобай, асабліва кандыдатаў партыі, якія складаюць вялікую праслойку ва ўсёй КП(б)Б. Напрыклад, ахоп кандыдатаў партыі вучобай па Бабруйску складае 25 проц., па Гомелі — 38 проц., па Церахайску — 31 проц., па Ніжнадзінску — 39 проц. Найбольш адстаюць, як гэта ня дзіўна, у сэнсе ахопу партыйнай вучобай кандыдатаў партыі асноўныя прамысловыя раёны, якія ў сярэднім ахапляюць партвучобай толькі 40 проц. кандыдатаў.

Ліст тав Сталіна зьяўляецца д

НА ПАРТЫЙНЫХ КАНФЭРЭНЦЫЯХ

У непрымірымым змаганьні на два фронты, шырока разьвіваючы бальшавіцкую самакрытыку, партыйныя арганізацыі яшчэ больш згуртаваліся вакол ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б

Менская

З дакладу старшыні гарадзкой кантрольнай камісіі т. КЕНІГА

Работа Менскай гарадзкой кантрольнай камісіі была падпарадкавана асноўнай задачы—узмацненьню ленінскага адзінства партыйных радоў, барацьбе на два фронты, за генэральную лінію партыі, за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

ГарКК правяла барацьбу з буржуазна-спакушальнымі тэндэнцыямі ў саўгасах і калгасах, з буржуазна-разлажнымі тэндэнцыямі на некаторых прадпрыемствах. ГарКК бязьлітасна ўдарыла па вылазках правасапартуністычнага пітуранага кулацтву з боку членаў партыі (справа былога гаркапсаюзу, райвалгасэкцыі і партканцылярыі прыгараднага сельсавету), а таксама па «лявацкіх» загібах і прыніжэньнях да іх.

Кантрольная камісія рашуча змагалася супроць спакушальнай ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Праяўленьні ўхілу да вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе — былі выкрыты сярод асобных членаў партыі ў **Камвузе** (Добкін, Мядзьведзева), на заводзе «Камунар» (справа Пяткевіча). КК спазналася разгавала на гэтыя факты, таксама як і на факты нацыянал-апартунізму (кавукова-пасьледыі Інстытут), антысэмітызму (польпедтэхнікум) і г. д.

Выкрываючы контр-рэвалюцыйную трацкісцкую кантрабанду, ГарКК моцна ўдарыла па тых, хто працягваў яе ў тэорыю і практыку. Зарка заключалася ў тым, каб, выкрываючы трацкісцкіх кантрабандыстаў і іншых либералам, павялічць тэарытычны ўзровень партарганізацыі.

ГарКК правяраала, як ажыцьцяўляюцца 6 умоў тав. Сталіна. Па прадпрыемствах яшчэ не пераключыліся на поўнае ажыцьцяўленьне сталінскіх умоў. Треба ў блізкійшы дні пабіцца крутога пералому ў гэтай справе.

Говорачы аб стане прамысловасьці, тав. Кеніг завасправе ўвагу на пытаньні ўнутрапрамысловага накапленьня. ГарКК ацэнавала вялікую ўвагу рацыяналізацыі, вынаходству, аўладаньню тэхнікай і г. д. Правяраючае абсьледаваньне становішча рацыяналізацыі і вынаходства выявіла вялікія дасягненьні на заводзе **«Бальшавік», «Камунар», на абутковай** фабрыцы і інш. Аднак, треба адзначыць, што ня большасьці прадпрыемстваў гораду справа вынаходства і рацыяналізацыі разгорнута слаба. Треба паставіць работу так, каб кожны рабочы прынёс увклад у рацыяналізацыі працы, прычым забіваецца таго, каб ні адна рацыяналізатарская прапанова рабочых не засталася невыкананай.

ГарКК правяла дыле праверкі тоду капітальнага будаўніцтва, а таксама абгаворвала гэта пытаньне на сваім пленуме. Як вядома, будаўнічы плян мінулага году ня выкананы. Тлумачыцца гэта тым, што бударганізацыі не правялі патрэбнай гібкасьці, не мабілізацыі мясцовых будматар'ялаў. Прычым, треба падкрэсьліць, што і да гэтага часу сыстэма работы бударганізацый не пабудавана такім чынам, каб з усіх аб'ектаў будаўніцтва вылучыць першачарговыя, укарэньня, і на скарэйшае іх пакіраваць усю ўвагу, усе сродкі. Існуе поўная блытаніна і ў справе забесьпячэньня будаўніцтва матар'ялам. Некаторыя маюць ліш іх асобных матар'ялаў, а на другіх іх яе хапае.

Мэханізацыя робот ужываецца зусім у нязначным разьмеры. Палуе ўрэгуляванасьць у зарплаце і абсьлужэньні ў рабоце. Будфінпляны не дапаўняюць да ўнад. Слаба йдзе падрыхтоўка кадраў.

Гарадзкая кантрольная камісія разам з ЦКК правяла абсьледаваньне менскай камунальнай гаспэкарэі пад кутом праверкі выкананьня пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б).

Абсьледаваньне выявіла поўную адсутнасьць кіраўніцтва работай жаўтаў з боку гарсакпсаюзу. Жаўты ня былі пераведзены на гаспразрахунак, у выніку фінансавае становішча іх было надзвычай напружаным. Фінансавая справаздачнасьць жаўтаў аказалася ў хаатычным становішчы. Жаўты № 3, 6, 17, 20 вымелі паваг улічку пазначанасьцяў і фонду кватэрнай платы. Нельга было ўстанавіць на што расходаваліся сродкі.

Абсьледаваньне ўстанавіла адсутнасьць гаспадарчага догляду помоў. Рад жаўтаў, якія патрабуюць вялікага развіцьця, разбуваюцца.

У справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ГарКК скансцентравала асноўную ўвагу на барацьбе са скажэньнямі дырэктыў партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, як цэнтральнай задачы, рашуча ўдарыўшы па «лявацкай» пагоні за дутымі процантамі калектывізацыі.

Рабочае забесьпячэньне—частка пытаньня барацьбы за прамфінплян. ГарКК абсьледавала ЗРК фабрык **«Кастрычнік», абутковай**, заводу **«Дрэваапрацоўшчык», ТСТ** і інш. Выявілася значнае замарожваньне тавараазвароту, ня ўменьне арганізаваць самазагатоўкі, дрэнная пастаноўка сыгнагацыкорму і г. д. Грамадзкае харчаваньне хоць і мае палепшэньне, аднак пастаўлена яшчэ дрэнна. Асабліва гэта датычыць заводу «Дрэваапрацоўшчык».

ГарКК распрацыла рашучыя меры па ліквідацыі ўсіх недахопаў у гэтай рабоце.

ГарКК правяла на 31 прадпрыемстве расчэтлівае абсьледаваньне ЦК УсеКП(б) і ЦК і ЦКК КП(б)Б аб работным шэфстве над сялянамі. Асабліва гэта работа была разгорнута ў часе абсьледаваньня ЦКК месячніка работы шэфства. У выніку мы атрымалі значны зрух. Аднак, пасьля месячніка треба канцентраваць асаблівае не гэтай работы.

Паводле пастановы пленуму ГарКК па горадзе Менску павінна быць ня менш 265 сацсуміначальнікаў. Між тым, на ўлічку ў ГБК ёсьць толькі 165. Прычым кажат і з вылучаных многія яшчэ не працуюць. На фабрыцы «Кастрычнік» вылучана 20 сацсуміначальнікаў у Наркамзем, але да гэтага часу яшчэ ні адзін не прыступіў да работы. Ня вылучыла яшчэ пісоцыяга сацсуміначальніка чыгунка.

Прафсаюзныя арганізацыі ў большасьці не дапамагаюць сацсуміначальнікам у іх рабоце. Пакідаюць адрас установы, куды ісьці і гэтым абмяжоўваюцца. Рад савецкіх устаноў таксама адносіцца да сацсуміначальнікаў бюрократычна. Неабходна адзначыць добрую работу сацсуміначальнікаў у Наркамсобесе, дзе шэфствуе гута. Там сацсуміначальнікі прымаюць жывы ўдзел у штодзённай рабоце наркамату.

Праведзены гарадскі зьлёт вылучэнцаў выявіў таксама рад ненармальных зьяўлеяў на ўчастках у кіраўніках устаноў. Задача ГарККК у далейшым больш запіцца правяраць работы вылучэнцаў на ўстановах пад кутом устанаўленьня той дапамогі, якая аказваецца ім у рабоце.

Пралетарская самакрытыка за апошні час узьнята на яшчэ вышэйшую ступень. У справе розгортваньня яе ёсьць відавочныя посьпехі. Аднак, радзім кіраўнікоў прадпрыемстваў яшчэ не ўсьвядомлена роля пралетарскай самакрытыкі, як штодзённага бальшавіцкага метаду работы. ГарКК рашуча ўдарыла па вінаватых у сарыжу самакрытыкі ў першай друкарні імя **Сталіна, на заводзе «Польная рэвалюцыі»** і г. д.

Треба адзначыць, што сэкцыя РСІ пры гарсавеце за апошні час ня дрэнна разгарнула работу. Праведзен пленум на ўстановы для праверкі выкананьня дырэктывы НК РСІ аб адпусткой кампаніі.

Абсьледавала 19-я школа, дзе выяўлен рад ненармальных зьяўленьняў. Апарат таго сэкцыя выкрыла рад злачынстваў жаўтаў у справе забесьпячэньня кватэрамі.

Групы сацэкспэдыцыі РСІ, якія арганізаваны пры 4-х калгасах і 2-х саўгасах, яшчэ працуюць слаба (апрача камуны «Бальшавік»). Ня лепш працуюць і сэкцыі РСІ пры сельсаветах. Задача заключаецца ў тым, каб ажывіць іх работу, дабіцца бяспушчанага росту ліку актыву з добраахвотнікаў.

ГарКК значную ўвагу ў сваёй работе сваравала на праверку выкананьня. Гэтаму треба будзе аддаць яшчэ больш увагі.

Ажыцьцяўленьне ўсіх задач, якія пастаўлены перад партарганізацыяй, магчымы толькі пры ўмове бязьлітаснай барацьбы на два фронты—супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі, супроць «левых» загібаў і прыніжэньня да ўхілаў ад лініі партыі.

Менская ГарКК пры дапамозе ўсёй парторганізацыі будзе праўільна весьці гэту барацьбу, стаяць на варце генэральнай лініі партыі.

Віцебская

Спрэчкі па дакладу тав. Іванова

На дакладу ЦК КП(б)Б тав. Іванова шырока разгарнуліся спрэчкі. Выказаліся 22 дэлегаты. Усе выступаючыя падкрэсьлівалі правільнае бальшавіцкае кіраўніцтва ЦК КП(б)Б на ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Дэлегаты канфэрэнцыі ўзялі пад жорсткую крытыку пасобныя звяны і вучасткі работы як мясцовых, гэтак і цэнтральных савецкіх і гаспадарчых устаноў. Т. т. **Міхалаеў і Карачэўскі** ўказалі на адсутнасьць адзінага культыляну, слабы рабочы кантроль над работай сярэдніх і пачатковых школ. Мэханічны тэхнікум—камбінат выхаваньня кадраў прамысловасьці—не атрымлівае належнага кіраўніцтва з боку ВОНГБ.

Выступаючыя дэлегаты ўказалі на слабасьць кіраўніцтва з боку ВОНГ тэкстыльнымі прадпрыемствамі. Падкрэсьлівалі паяўнасьць перабоў у рабоце тэкстыльных фэбрык за нерэгулярныя дачы БелДРЭС электраэнэргіі.

Тав. Дыксон (фабрыка Лекерта) указаў на недапушчальна слабую работу па ўкараненьні 6 умоў тав. Сталіна па асобных фабрыках, асабліва ў галіне паляпшэньня бытавых умоў рабочых. ЦРК і ЭРК дагэтуль яшчэ не перабудавалі сваёй работы. Скажэньні палітыкі цэн, «нэпманскі дух»—усё гэта яшчэ мае месца ў рабоце каапэрацыйных арганізацый.

Партарганізатар чыгуначнага вузла **тав. Строгін** скансцентраваў увагу ў сваім выступленьні на дрэнай рабоце Віцебскага вузла. Праз Віцебскі вузел штодзённа праходзіць 72 цягніка і ў сярэднім кожны цягнік спазьніваецца на 1½ гадзіны. Кіраўніцтва апарату 6-га рабочу не пераключылася на рэалізацыю загаду Андрэева, па выкананьне дырэктыў партыі аб паляпшэньні работы транспарту. У апараце раёну, замест 136 ч., працуюць 162. На адны толькі звыштэрміновыя работы за паўгода перавыдаткавана 14.000 руб. Увесь перавыдатак за гэты час складае 37.000 руб. Зусім дрэнна стаіць справа з вучотам сацслабаркіцтва і ўдарніцтва.

Дырэктар фабрыкі **«Дзьвіна» тав. Плаўнік** указаў на марудасьць ходу ільназагатовак. Загатавіцельныя арганізацыі не зварачаюць увагі на якасьць ільну, што вельмі адбіваецца на рабоце фабрыкі. Далей тав. Плаўнік прыводзіць лічбы страт, якія фабрыка нясе з-за перабояў у падачы электраэнэргіі БелДРЭС. Канкретна, страты фабрыкі складаюць 500 тыс. руб. У гэтым, галоўным чынам, вінавата кіраўніцтва ВОНГБ, якое дрэнна кіравала БелДРЭС.

— Нельга прайсьці міма дрэннай работы Віцебскай спажывецкай каапэрацыі — **гаворыць тав. Кавалёў** — дэлегат канфэрэнцыі — калгаснік. Кіраўніцтва спажыўкаапэрацыі не перабудавала сваёй работы, ня вытручае яшчэ ямпанскі дух, **нявыразна** працуе апарат.

Тав. Бондараў, выкрываючы прычыны прарыву па Віцебскім вузле, указвае на няправільную расстаноўку партыйных сіл у вязавых зьвеньнях і вучастках. Зусім слаба праводзіцца сярод чыгуначнікаў выхаваўчая работа, асабліва сярод новых рабочых. Незадавальна камуністы зьяўляюцца прыкладнымі на вытворчасьці. Есьць факты, калі пасобныя сакратары партячэек паказваюць дрэнны прыклад работы, пакідаюць варгітаты бруднымі і г. д.

У сваім выступленьні **тав. Разьлінаў** указаў на цэлы рад дасягненьняў, якія мае арганізацыя, дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі. Лучэйкі, якія сапраўды перабудавалі сваю работу, маюць добрыя вынікі, але там, дзе да ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна падышлі фармальна, прарывы ня толькі ня ліквідуюцца, але ваган пагыбляюцца.

Нельга прайсьці міма зусім нездавальняючага кіраўніцтва ВОНГБ прадпрыемствамі. ВОНГБ ня перабудаваў сваёй работы ў бок канкрэтнага праміочнага кіраўніцтва прадпрыемствамі. Як прыклад, **тав. Разьлінаў** указаў на «Чырвоны кнталіст», якому **12 раз мянялі вытворчую праграму.** З-за перабояў у падачы электраэнэргіі БелДРЭС, за адзін толькі лістапад віцебскія прадпрыемствы панесьлі страты больш 3 млн. руб. Але,—кажа тав. Разьлінаў,—пасобныя кіраўнікі спэкулююць гэтым, імкнуцца дрэнная работай БелДРЭС прыкрыць сваю бязьдзейнасьць.

У пытаньні арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў,—гаворыць тав. Разьлінаў,—віцебская арганізацыя робіць толькі першыя крокі. У радзе калгасаў яшчэ маюць месца кулацка-спажывецкія, рвацкія настроі, супроць якіх треба весьці рашучую барацьбу.

Былы чырвоны партызан чырвонастандарац тав. Шубін зьвярнуў увагу канфэрэнцыі на недапушчэньне з боку раду арганізацый, калгасаў, саўгасаў важнасьці кадраў, як цягавай сілы. Тав. Шубін прыёўр рад фактаў дрэннага догляду коней, нерацыянальнага іх скарыстаньня.

Цэлы рад выступаўшых таварышоў у сваіх прамовах правільна ўказвалі на сапраўдныя прычыны прарываў—абязьлічка, ураўнілаўка, якія ёсьць на пасобных прадпрыемствах. Зусім ня так выступіў дырэктар фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» тав. Драгілеў. «ЦК шэйнікаў не дае нам дырэктыў аб ліквідацыі ўраўнілаўкі»,—кажа тав. Драгілеў. Для тав. Драгілева як быццам ня ясны ўказаньні тав. Сталіна, яму мала цэлага раду партыных і гаспадарчых дырэктыў аб ліквідацыі ўраўнілаўкі і абязьлічкі, ён чакае яшчэ нейкіх дадатковых указаньняў.

Ня цяжка бачыць, чаго варты гэтыя «прычыны».

З такім-жа апартуністычным разважаньнем выступіў старшыня ЦРК тав. Гецэвіч, які абвінаваціў дрэнную работу ЦРК, не гаварыў аб момантах скрыўленьня савецкай палітыкі цэн, ігнараваньня дырэктыў партыі і ўраду, аб папярэдняй саказагатовак і разгортваньні савецкага гандлю. Віну за дрэнную работу ён імкнецца перавесьці выключна на Белкаапсаюз.

Пасьля спрэчак і заключэньня прамовы тав. Іванова канфэрэнцыя ў адпаведнасьці з дакладам і прынятай пастановай ўхвалила палітычную лінію ЦК КП(б)Б.

Гомельская

Спрэчкі па дакладах ЦК і ЦКК КП(б)Б

Спрэчкі па дакладах т. т. **Шаранговіча і Турлая** былі пасьвячаны дзелавым зьместам на важнейшых пытаньнях работы і праходзілі пад знакам пырокай бальшавіцкай самакрытыкі.

Усе выступаўшыя дэлегаты аднадушна ўхвалілі палітычную лінію ЦК і ЦКК КП(б)Б, адзначалі вялізарнейшыя посьпехі, дасягнутыя КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК і ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, на аснове ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, правядзеньня ленінскай нацыянальай палітыкі, у барацьбе за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. Вынікі трэцяга году пяцігодкі, першыя вынікі ажыцьцяўленьня ўказаньняў тав. Сталіна з усёй відавочнасьцю паказваюць вялізарнейшыя сацыяльна - эканамічныя зрухі, якія адбыліся ў БССР, далейшае умацаваньне пазыцый сацыялізму.

Дэлегаты канфэрэнцыі адначасова рэзка крытыкавалі работу пасобных гаспадарчых цэнтральных устаноў, якія яшчэ ня здолелі перабудаваць сваёй работы ў адпаведнасьці з указаньнямі тав. Сталіна, і недахопы работы якія моцна адчуваліся ў пізасных зьвеньнях прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Тав. Генкін (Селькаш) адзначыў у сваім выступленьні ненармальнае становішча са скансцэньнем пляну капітальнага будаўніцтва Гомсельмашу. З вызначаных на капітальнае будаўніцтва 2 млн. 700 тыс. руб. асвоена 1 млн. 700 тыс. руб. Асыгнаваньні 1932 г. у разьмеры 1 млн. руб. не ахапляюць усіх патрэбнасьцій, якія выражаюцца ў 2 млн. 500 тыс. руб. Неабходнасьць хутчэйшага скансцэньня заводу відавочна. Ён зьяўляецца важнейшым фактарам у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, як матэрыяльнай базы сацыялізацыі. Треба ва што-б там ні стала адпушчаць сродкі на скансцэньне будаўніцтва. Плянаваньне работай заводу з боку Белмэталаб'яднаньня і Саюзсельмашу вельмі слабае. Наперакор указаньню тав. Сталіна аб замацаваньні на прадпрыемствах рабочай сілы, Гомсельмаш у результаце такога «плянаваньня» вымушан адпускаць на першы квартал 500 рабочых, а потым іх зноў набіраць і навучаць. Вялікія недахопы ёсьць у рабоце Белканторы Стальбыту. Тут пануюць самацёк, бюракратызм, ненаваротлівасьць. Запаяўкі на сырэц скрозь і ўсюды бяспрычынна ўрозваюцца.

Тав. Генкін падкрэсьлівае, што ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва ёсьць вялікія посьпехі, але маецца яшчэ і рад недахопаў. Гаркомпартыі мабілізаваў масы на іх ліквідацыю, на барацьбу з ухіламі ў нацпытаньні.

Тав. Белёнькі (Гарпрафсавет) гаворыць аб дасягненьні ў рабоце прафсаюзаў, пасьля чаго адзначае, што ў рабоце апарату Белкаапсаюзу і яго асобных работнікаў, якія выяжджаюць на месцы, часта няма ўзгодненасьці. Былі выпадкі арганізацыі выяжджаўшымі работнікамі БКС — саўгасрабкопаў, а потым БКС гэта забараніў. Нарады БКС часта не даходзяць да нізу.

Тав. Клябанаў (Гарком КП(б)Б) падрабязна гаворыць аб дасягненьнях БССР на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Спыняючыся на адмоўных зьявішчах, тав. Клябанаў указвае на недапушчальнасьць бясплянавых паралельных абследваньняў і шматлікіх паездаў розных брыгад і камісій на прадпрыемствы. Пастанова ЦК КП(б)Б, якая забараняе падобныя зьявішчы, часта парушаецца.

Наглядаюцца факты гаспралёрства, няўменьня пры прыезьдзе на фабрыку або завод дапамагчы рабоце, даць канкрэтныя ўказаньні. Гэтыя зьявішчы, напрыклад, мелі месца пры прыезьдзе на Добруш дырэктара Белпаперы тав. **Аўг**, па лініі Хлебааб'яднаньня і інш.

Тав. Хаўкін (Гарсавет) спыняецца на пытаньні камунальнага будаўніцтва. Цэнтральныя будаўнічыя арганізацыі яшчэ зусім не падрыхтаваліся да вясэнна-летніх работ. Наркамгас і Белжылсаюз усё яшчэ «дагаварваюцца», а на мясцох няма выразнасьці. Для Гомеля ня вызначаны яшчэ навак аб'екты будаўніцтва.

Нельга прайсьці і міма таго, што Наркамгас і Наркамфін у радзе выпадкаў проста недапэньваюць пытаньня разьвіцьця камунальнага будаўніцтва Гомеля, ня гледзячы на тое, што гэта адзін з буйнейшых пралетарскіх цэнтраў БССР.

Дрэнна стаіць справа з разьвіцьцём прыгарадных саўгасаў. Прыгарадныя саўгасы ня маюць ніякіх плянаў свайго разьвіцьця.

Тав Галубіцкі (завод імя Ланцуцкага). Рэканструкцыя заводу тармозіцца ў сувязі з адсутнасьцю цьвёрдай устаноўкі ў ВОРЗ'а, неадпаразовай зьменай ім сваіх меркаваньняў. Завод да гэтага часу ня мае свайй сталоўкі. На паляпшэньне бытавых умоў рабочых адпушчана толькі 60 тыс. руб. Тав. Галубіцкі далей гаворыць аб узмацненьні супраціўленьня клясавазварожых элемэнтаў правядзеньню ленінскай нацыянальнай палітыкі. Партарганізацыі абавязаны яшчэ больш узмацніць сваю ўвагу да пытаньняў барацьбы з ухіламі ад лініі партыі ў нацпытаньні, зжыць недахопы, якія ёсьць у нацыянальна-культурным будаўніцтве.

Тав. Хандогі (дрэваапрацоўчы камбінат). Беллесправ ня ведае свайго сырцовага балянсу. У пытаньнях разьвіцьця дрэваапрацоўчай прамысловасьці Леспрамам дапушчан рад недахопаў. Будаўніцтва прадпрыемстваў іншае без выстарчальнай увязкі з сырцовай базай, у сілу чаго зараз прыходзіцца ламаць праграмы, частка абсталяваньня застаецца незагружанай. Адсутнасьць сырцовага балянсу ў Беллесправе тармозіць будаўніцтва лесазаводу, які ўваходзіць у камбінат.

Т. Левіт (бюро скаргаў ГарКК-РСІ) адзначае вялікія дасягненьні ў рабоце ЦКК КП(б)Б у барацьбе за чыстату генэральнай лініі партыі, за ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва. У якасьці асобных недахопаў у рабоце апарату ЦКК НК-РСІ, тав. Левіт прыводзіць некаторыя факты маруднага разгаваньня на матар'ялы, якія пасылаліся з раёнаў, а таксама выпадкі не даволі канкрэтнага кіраўніцтва раённым бюро скаргаў з боку цэнтральнага бюро.

Тав. Леўтаў («Пралетары») гаворыць:—цэнтральныя арганізацыі заціягваюць заключэньне генэральных згод, што прыводзіць да зрыву заключэньня лёкальных дагавароў. Часта дагавары не канкрэтныя. Няма практычных абавязальстваў. Такія безадказныя дагавары асабліва прабуюць заключыць арганізацыі, якія снабжаюць прадпрыемствы сырцом, Гэтым усклад няецца ажыцьцяўленьне адзяй з умоў **тав. Сталіна** аб укараненьні гаспадарчага разрахунку. З боку Белкаапсаюзу шмат недахопаў у рабоце. Пляны снабжэньня складаюцца па-бюракратычнаму. Ня ўлічваецца павялічэньне рабочых на заводах. Ударныя прадпрыемствы часта не забясьпечаны снабжэньнем. ЗРК яшчэ працуюць у большасьці дрэнна, нярэдка значна горш, чым раней працавалі ЦРК. Белкаапсаюз забараніў разьвіцьцё пры ЗРК сьвінгадкормачных пунктаў, матывуючы гэта тым, што ў гэту справу нельга ўкладаць каапэратыўных сродкаў. Гэта зусім няправільна і тармозіць паляпшэньне снабжэньня рабочых. Тав. Леўтаў адзначае посьпехі і недахопы гомельскай партарганізацыі ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Тав. Палякоўскі (чыгунка) — ЦК КП(б)Б аддаваў вельмі шмат увагі транспарту. Штодзённае апаратыўнае кіраўніцтва ЦК КП(б)Б забясьпечыла ўжо значныя зрухі на транспарце, прыватнасьці і на Гомельскім вузле, які ўваходзіць у лік перадавых раёнаў БССР. Тав. Палякоўскі падкрэсьлівае дасягненьні Гомеля ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва, гаворыць, што, кажучы аб яшчэ наяўных вялікіх недахопах, нельга адрываць ад набытых посьпехаў.

Тав. Сіўцоў, Мазураў спыняюцца на пытаньнях арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, на ўмацненьні плянавасьці ў рабоце калгаў, аб паляпшэньні і канкрэтызацыі кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю.

Тав. Рубін — (гарком КП(б)Б)—КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК забясьпечыў БССР буйнейшыя перамогі. ЦК КП(б)Б прарабіў вялізарную работу на перабудове партработы, на паляпшэньні, паблізканьні да нізавых зьвеньняў вытворчасьці.

Асобныя цэнтральныя органы вельмі слаба рэалізуюць дырэктывы ЦК КП(б)Б. Так, цэлы рад пастаноў ЦК аб паляпшэньні работы ЗРК добрускай папяровай фабрыкі Белкаапсаюзам не выкананы. ЗРК і зараз працуе з рукавой дрэнна. Работнікі БКС нярэдка яшчэ займаюцца гастралёрствам.

Шмат недахопаў у рабоце Дзяржплану БССР. Ён яшчэ не праўўлены ўменьня сканцэнтраваць будматар'ялы на рашаючых ударных будоўлях. Матар'ялы з вялікага будаўніцтва—Шклобуду, расыпаюцца (як напрыклад, перадаюцца Налесдруку), а ў результаце затрымліваецца ход ударнага будаўніцтва. Далей, тав. Рубін спыняўся на задачах марксыцка-ленінскага выхаваньня партарганізацыі і рабочых мас.

У спрэчках таксама выказаліся т. т. **Кузьмічоў, Карнееў, Йсцылеў, Дэцкі, Мзэрэн.**

З дакладу начальніка ПУАКР'а на 10 партканфэрэнцыі БВА т. Аранштама

Асноўным задачы, пад выпаўненьнем якіх зараз працуе наша партыя і ўся рабочая класа,—гэта задачы **заваёўваньня першай пяцігодкі.**

У 1932 годзе мы заканчваем пяцігодку за 4 гады. Гэта ёсьць лепшы **доказ правільнасьці палітыкі нашай партыі, правільнасьці ленінскай устаноўкі,** якая з надзвычайнай дакладнасьцю і выразнасьцю праводзіцца ў жыцьцё бальшавіцкай партыяй.

Ня так даўно праходзіла сэсія ЦВК Саюзу, якая ў лічбовых паказальніках падвяла вынікі першых трох год пяцігодкі.

У той час, як мы з посьпехам заканчылі набудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі, дасягнулі рашаючых перамог у рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, пабывалага росту дабрабыту рабочай клясы і шырокіх мас працоўнага сялянства — эканамічны крызіс патрасае ўстоі капіталізму ва ўсіх без выключэньня капіталістычных краінах.

З кожным днём у краінах Захаду і «залатой» Амэрыцы скарачаецца вытворчасьць, расьце армія беспрацоўных.

Наш рост зьяўляецца результатам барацьбы мільённых працоўных мас пад кіраўніцтвам ленінскай партыі за пабудову сацыялізму, результатам ажыцьцяўленьня ў гаспадарцы сацыялістычнай сыстэмы, якая дае магчымасьць узьняць на небывалую вышыню індустрыялізацыю краіны і разьвіцьцё сельскай гаспадаркі.

Упадак капіталістычнай гаспадаркі, нагыбленьне эканамічнага крызісу, рост беспрацоўя — ёсьць просты результат канкрэтнага капіталістычнай сыстэмы, результат няздольнасьці капіталізму разьвіваць вытворчыя сілы.

Капіталістычны сьвет шукаючы выхаду з эканамічнага крызісу, імкнецца яго знайсьці ў вайне і ў першую чаргу супроць Савецкага Саюзу. Сусьветны капіталізм ужывае ўсе меры для таго, каб навязаць СССР вайну. Аб гэтым гаворыць цэлы рад канкрэтных фактаў.

Савецкі Саюз пільніна праводзячы палітыку міру, навышаючы тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, рыхтуецца да абароны, умацоўвае баявую моц сваёй Чырвонай армії.

Рыхтуючыся да абароны Савецкага Саюзу, треба памятаць аб тым, з кім прыдзецца весьці ў будучым вайну. Працэс «прамапартыі» ясна паказаў, што блізкэйшым магчымым праціўнікам, які паспрабуе напасьці на нас, будзе буржуазная фашыцкая Польшча. Але треба памятаць, што пытаньні аб нападзе Польшчы на Савецкі Саюз і яго фарпост БССР ня зводзіць толькі да польска-савецкай вайны.

Треба памятаць, што магчымая польска-савецкая вайна будзе вайной супроць краіны пралетарскай дыктатуры з боку імпэрыялістычных дзяржаў. Ня важна, што на палёх бою будуць салдаты з боку праціўніка апрануты ў польскую форму. Треба памятаць, што гэтыя салдаты будуць страляць з французкіх кулямётаў. Бамбардзіраваць будзе французкая авіяцыя.

Мы гэта шчэрасьліваем таму, каб кожны працоўны ведаў, што мы будуем моцную тэхніку Чырвонай армії, указоўваем армію таму, што на палёх бою сустрэнем далёка не слабага праціўніка. Нам у адкрытых бойках прыдзецца сустрэць праціўніка, які будзе ўзброєн тэхнікай ня толькі сваёй краіны, але і будзе мець рэзервы ў капіталістычных краінах.

З гэтага зусім не вынікае, што мы слабы для змаганьня з гэтым надзвычай падрыхтаваным праціўнікам. Мы рыхтуемся ня толькі змагацца з гэтым праціўнікам, калі ён спрабуе напасьці на нас, але і перамагчы яго ў адкрытым баі. Гарантыя нашай перамогі закладзена ў далейшых посьпехах па індустрыялізацыі нашай краіны, у тых вялізарных рэзервах, якія мы маем у радах рабочай клясы ўсяго сьвету.

На палёх бою будучай вайны два фактары будуць вырашаць намінуючую перамогу Чырвонай армії. Першы фактар — гэта наша індустрыя, прамысловасьць, наша пяцігодка. Другі фактар — сілы ўнутры капіталістычных краін, якія мы маем у асобе пралетарыяту.

Пераходзячы да характарыстыкі работы партарганізацыі па ўсіх галінах базавой і палітычнай падрыхтоўкі. Перш за ўсё пытаньне аб тым, што сабой прадстаўляюць часьці Беларускай Вайсковай Акругі з пункту гледжаньня сацыяльнай і партыйнай праслойкі, якасьці гэтых важнейшых зьвеньняў у справе базавой падрыхтоўкі і вывучэньня тэхнікі.

Зараз для кожнага зразумела, што мы маем лепшы чым раней сацыяльны склад часьцей нашай акругі ў сувязі з папаўненьнем, якое мы атрымалі ў мінулым годзе.

Калі на 1 студзеня 1931 году **рабочая праслойка** ва ўсіх часьцях акругі раўнялася 19 проц., то на 1 студзеня г. г. яна дасягае 28 проц. Рост рабочай праслойкі ў Чырвонай армії ёсьць результат паўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, результат росту рабочай клясы, індустрыяльнай моцы нашай краіны.

Адначасова з ростам рабочай праслойкі мы маем і **вялікі рост партыйна-камсамольскай праслойкі ў часьцях нашай акругі.** Апошнее паўтаўленьне мы атрымалі ня толькі значна лепшае ў параўнаньні з мінулымі прызывамі на сацыяльным і партыйным складзе, але і лепшы па ніжэйшу асьветы, па пісьменнасьці.

Будзе зусім правільным, калі мы скажам, што апошнее паўтаўленьне вылучэцца больш палітычна-сьвядомым і больш блізкім да нас. Але тут ня трэба забываць на тое, што наш гігантскі рост вялікае паўтаўленьне супраціўленьне клясава-варожых элемэнта. За апошні час мы сустракаемся са спробамі клясавага ворага пралезьці ў рады Чырвонай армії, каб праводзіць шкодніцкую падрыўную работу.

Мы з усёй рашучасьцю павінны змагацца з бяспекамі аслабіць марксыцка-ленінскае выхаваньне байца.

Ня трэба забываць вядомае выступленьне тав. **Сталіна** на канфэрэнцыі аграрнікаў марксыстаў і тав. **Постышава** на партканфэрэнцыі Краснапресьненскага раёну, дзе яны з усёй выразнасьцю падкрэсьлілі, што наш калгаснік яшчэ мае патрэбу ў палітычнай апрацоўцы, што ён яшчэ толькі ўчора пакінуў свае ўласную гаспадарку і што калгаснік за кароткі час знаходзіцца ў калектыве яшчэ ня зжыў дробна-ўласьніцкіх настрояў.

Задача бальшавікоў армії заключаецца ў тым, каб з калгасьніка-**ямі знаходзіцца ў Чырвонай армії, правесьці такую работу, якая-б спрыяла набліжэньню яго да рабочага, зжываньню ўласьніцкай псіхалёгіі.**

У нас ёсьць даволі сіл і магчымасьцей, каб правесьці ўзмоцненую барацьбу з супраціўляючымі настроямі, з недапушчай сучаснай палітычна-партыйнай работы. Мы маем усе магчымасьці для высокаякаснага палітычнага выхаваньня нашага байца.

За апошні год мы маем надзвычай вялікі рост нашай партыйнай арганізацыі. Гэты рост зьяўляецца результатам палітычнай работы, результатам росту дысцыплінаванасьці і палітычнай сьвядомасьці шырокіх мас чырвонаармейцаў. Адначасова з радам станоўчых бакоў у росьце партарганізацыі, мы наглядаем у пасобных часьцях нейсую кампанейшчыну і зусім невыстарчальную работу на марксыцка-ленінскім выхаваньні маладых членаў і кандыдатаў партыі.

На прыкладзе цэлага раду вайсковых часьцей мы бачым, якую вялізарную ролю адыгрываюць партыйныя і камсамольскія арганізацыі ў страхавой падрыхтоўцы сваёй часьці. Мы маглі-б падаць дзесяткі прыкладаў, калі камуністы і камсамольцы даюць значна большы процант выкананьня стральб чым беспартыйныя.

Але па жаль у радзе пасобных часьцей мы маем такое становішча, што партыйна-камсамольская арганізацыі робяць залёка ня ўсё для арганізацыі лепшай стралковай падрыхтоўкі, яго вывучэньня і аўладаньня новейшай тэхнікай.

У цэнтр увагі кожнай партыйнай арганізацыі павінны быць паставлены пытаньні **баявой падрыхтоўкі,** пытаньні **захапаньня і вывучэньня тэхнікі** аўладаньня формамі і мэтадамі сучаснага бою.

Адначасова з узмацненьнем работы на лініі баявой падрыхтоўкі, партарганізацыі павінны рашуча змагацца з усякімі адхіленьнямі ад нацыянальнай палітыкі партыі, змагацца за тэарытычную падрыхтоўку нацыянальных кадраў і за бесьпячэньне марксыцка-ленінскага выхаваньня байцоў на іх роднай мове.

Наш камандна-палітычны склад за апошнія гады значна вырас. Гэтаму росту, у першую чаргу сарыяны камандзірская вучоба, узросшая ўвага да лепшага партыйных арганізацый да камандзіра.

Але залёка яшчэ не ва ўсіх часьцях нашай акругі ўзьнята на належную палітычную вышыню камандзірская вучоба. Т

Склад кіруючых органаў Менскай гарадзкой арганізацыі КП(б)Б, выбраных II паотканфэрэнцыяй

Члены Менгаркому КП(б)Б

Сталін, Каганович, Молатаў, Варашылаў, Гікала, Шаранговіч, Галадзед, Грысевіч, Рыкоў, Кавальчук, Іваноў, Рыскін, Шпэктараў, Цімашэнка, Багачоў, Белякоўская (раб. з «Полымя рэвалюцыі»), Грыцкевіч, Голуб, Шаблоўскі, Буткевіч, Праліч, Шатрун, Ракасоўскі, Кардзенк, Красных, Стабін, Рыўкіна, Домараў, Зайцаў, Бельскі, Мураш-ка, Карасік, Мароз, Іваноў, Беланоўскан, Карповскі, Каждан, Ладуцька, Гелер, Тарасеў, Дукельскі, Мосін, Шульгін, Гарагляд, Бандарчык, Мартыненка, Сасевіч, Вайчук, Цапкаваты, Хайфец, Саковіч, Рохкінд, Мацюкоў, Фельдман, Кацман, Жымонзік, Розінберг, Валодзька, Мельзьведаў, Тарасевіч, Дзічкоўскі, Пажывілка, Гольдберг, Дунец, Сьвірыдаў, Капілевіч, Каранеўскі, Гіршык, Розін, Пэрман, Аксенцаў, Янковіч, Плешакоў, Кузьняцоў, Бабок, Сьлівец, Дэйч, Штейн, Гарын, Карначоў, Палякоў, Атаровіч, Добрын, Пінхасік, Мітлін, Кержановіч, Рубінская.

Кандыдаты ў члены Менгаркому КП(б)Б

Голубеў, Філіновіч, Фін, Гершэльман, Сіманоўскі, Александровіч, Шусэр, Каўшовіч, Рыкала, Шэлег, Карпека, Майсак, Азерскі, Зайцаў, Быткоўскі, Вайнер, Шнідер, Кантар, Кац, Аніоў, Пягруцін, Мэерович, Пячонка, Асінчук, Бейлін, Дзянок, Нісэмбаўм.

Члены Менскай гарКК КП(б)Б

Калнін, Турлай, Кенін, Розінскі, Сусанава, Дамброўскі, Каланіцкі (машыніст МВБ чыг.), Майзіт, Цынат, Нанко, Каламец, Шнітко, Язерскі (рабочы друкарні імя Сталіна), Кулікоў, Кавлоўскі (сакратар яч. шчотачнай фабрыкі), Хадасевіч, Камейка (рабочы заводу «Польмя рэвалюцыі»), Готяіб (работніца абутковай ф-кі), Гарбштэйн, Лейчкет, Старавойтаў, Кастрынскі (рабочы заводу імя Мостатва), Марозаў, Арлоў, Малашка (рабочы чыгункі), Кусцінер (калгасьнік калгасу імя Варашылава), Розан (рабочы Менбуду), Маркер (рабочы Балдзяржбуду), Голубеў (рабочы заводу імя Варашылава), Пастухоўіч (работніца з-ду «Полымя рэвалюцыі»), Протасевіч, Янсон, Кандрукоў (рабочы Вадаканалу) Міткевіч (рабочы заводу «Пралетары»), Гальперын (мастар заводу «Камунар»), Васілевіч (старшыня заўкому хлебазаводу), Канопік, Борэйко (опер. мясокомбінату), Красік (рабочы заводу «Ударнік»), Кудраеў, Скорман, Элькінд (рабочы заводу імя Варашылава), Керзнер (рабочы зав. Бальшавік), Дабралюбаў (раб. зав. «Бальшавік»), Маеўскі (сакратар Караліщанскай ячэйкі), Мацюк (трактарыст саўгасу «Заціішша»), Багачунас (рабочы фабрыкі «Кастрычнік»), Рудзецкая (работніца фабрыкі «Кастрычнік»), Яворская (работ. ф-кі «Кастрычнік»), Міндель (рабочы заводу «Чырвоная зорка»), Падар, Штэйман, Альтшулер (рабочы Менбуду), Шчальжнаў, Профеў (чырвонаармеец №-скай дывізіі), Васьковіч, Кавалёў, Шульман, Зайцаў.

Члены рэвізійнай камісіі

Нісенбаум, Белаўоўскі, Фрыдман, Вайнэровіч, Андрэеў, Голанд, Бальшінік.

КАНДЫДАТЫ:

Бераназ, Капялевіч.

Першы пленум Менгаркому КП(б)Б

ПЕРШЫ АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б ВЫБРАЎ БЮРО Ў ЛІКУ 15 ЧЛЕНАЎ І 5 КАНДЫДАТАЎ.

ЧЛЕНЫ БЮРО ГАРКОМУ

Кавальчук, Шпэктараў, Грыцкевіч, Каждан, Карначоў, Валодзька, Каранеўскі, Шульгін, Дукельсаі, Цімашэнка, Багачоў, Тарасевіч, Дзічкоўскі, Вайчук, (раб. з-ду «Бальшавік»), Праліч (работніца чыгункі).

КАНДЫДАТЫ Ў ЧЛЕНЫ БЮРО.

Янковіч, Мацюхоў, Красных, Карвоўскі, Рохкінд.

ПЛЕНУМ ВЫБРАЎ ПЕРШЫМ САКРАТАРОМ ГАРАДЗКОГО КАМІТЭТУ КП(б)Б ТАВ. КАВАЛЬЧУКА І ДРУГІМ САКРАТАРОМ ГК КП(б)Б ВЫБРАЎ ТАВ. ШПЭКТАРАВА.

ПЛЕНУМ ЗАЦЬВЕРДЗІЎ: ЗАГАДЧЫКАМ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ІНСТРУКТАРСКАГА АДДЗЕЛУ—ТАВ. КАЖДАНА, ЗАГАДЧЫКАМ АДДЗЕЛУ КУЛЬТУРЫ І ПРАПАГАНДЫ—ТАВ. ГРЫЦКЕВІЧА, ЗАГАДЧЫКАМ АДДЗЕЛУ АГІТАЦЫІ І МАСАВЫХ КАМПАНІЯЎ—ТАВ. КАРНАЧОВА І ЗАГАДЧЫКАМ АДДЗЕЛУ КАДРАЎ—ТАВ. МАЦЮХОВА.

Склад сакратарыяту

ПЛЕНУМ ЗАЦЬВЕРДЗІЎ САКРАТАРЫЯТ ГАРКОМУ КП(б)Б У НАСТУПНЫМ СКЛАДЗЕ:

ЧЛЕНЫ:

Кавальчук, Шпэктараў, Грыцкевіч, Каждан, Карначоў, Шульгін, Валодзька.

КАНДЫДАТЫ:

Мацюхоў, Янковіч, Каранеўскі.

Члены прэзыдыуму Менскай Гарадзкой Кантрольнай Камісіі КП(б)Б

Кенін, Хадасевіч, Кудраеў, Шнітко, Арлоў, Камейка, Рудзецкая, Кастрынскі, Цынат.

КАНДЫДАТЫ:

Каламец, Лаўкет, Канопік, Альтшулер.

Парткалегія

Кенін, Хадасевіч, Кудраеў, Шнітко, Таў, Суханава, Шчалжнаў, Пастуховіч, Янсон, Малашка.

СТАРШЫНЁЙ МЕНСКАЙ ГАРКК КП(б)Б АБРАНЫ ТАВ. КЕНІН. САКРАТАРОМ ПАРТКАЛЕГІІ — ТАВ. ХАДАСЕВІЧ.

РЭВІЗІЙНАЯ КАМІСІЯ ВЫЯЎЧЫЛА СА СВАЙГО СКЛАДУ СТАРШЫНЁЙ РЭВ. КАМІСІІ ТАВ. НІСЭНБАЎМА І НАМЕСЬНІКАМ СТАРШЫНІ — ТАВ. ВАЙНЭРОВІЧА.

Сьпіс дэлегатаў выбраных на XIV зьезд КП(б)Б з пастаноўчым голасам ад Менскай партарганізацыі

Сталін, Каганович, Молатаў, Варашылаў, Гікала, Шаранговіч, Галадзед, Сігавінскі, Калінін, Убаровіч, Чарнушэвіч, Грысевіч, Рыкоў, Бэнэк, Платун, Сухана-ва, Хаскін, Матсон, Палякоў, Гарын, Кавальчук, Шпэктараў, Грыцкевіч, Каждан, Гніляковіч, Кенін, Хадасевіч, Валодзька, Каранеўскі, Шульгін, Янковіч, Цімашэнка, Багачоў, Баброў, Сяфрااў, Ракасоўскі, Васілевіч, Дукельскі, Гуровіч, Розін, Дубіна, Кавалёў, Рохкінд, Гелер, Тарасевіч, Хаскін, Фельдман, Майсак, Кузьняцоў, Азерскі, Маеўскі, Раманович, Кержановіч, Мацюхоў, Аксенцаў, Вайнер, Балдзярчык, Гольдберг, Дзічкоўскі, Кац, Кроль, Цэнцыпер, Плятнёў, Гуровіч, Саенін, Дунец, Белякоўская, Кавецкі, Купрэеў, Гурыц, Кацер, Роман, Роткіна, Вялічка, Мароз, Вайчук, Дабралюбаў, Кастрынскі, Мурашка, Баранаў, Міндель, Капілевіч, Голуб, Праліч, Гельман, Багдановіч, Палякоў, Багавец, Алашкевіч, Розэнберг, Пятатаў, Гарагляд, Гопман, Скачэлес, Давідоўскі, Бутылёў, Рубінская, Марусевіч, Баскін, Аксючыц, Готяіб, Зільберт, Кандрукоў, Нікалаеў, Пінтальнік, Голубеў, Герчык, Эфраімовіч, Гейман, Хэйфец, Караеў, Амбражэйунас, Шапіра.

З ДАРАДЧЫМ ГОЛАСАМ:

Кудраеў, Канопік, Асінчык, Цапкавы, Кац, Нісэнбаўм, Пагольскі, Штейн, Каваліёў, Гершэльман, Капялевіч, Карасік, Пінхасік, Добрын, Ткачэнка, Ленькоў, Анісіў, Школьнікаў, Яноўскі, Іофэ, Кантар, Эйдэльберг, Дэйч, Наўкальціс, Фрыдман.

Два шляхі, два вынікі...

Прайшло новагоднія сьвята. Адзванілі новагоднія царкоўныя званы. Пакаціліся будзённыя дні 1932 году. Але ня зьменшылася тая трывога, той усеагульны пэсымізм, якім быў ахоплен увесь буржуазны сьвет, калі ён папрабаваў на мяжы двох год падвесьці некаторыя вынікі. Гэта трывога і гэты пэсымізм зусім не зьяўляюцца якімнебудзь празьмерным захапленьнем газэтных нісак. Ён характэрны для найбольш буйных, найбольш салідных прадстаўнікоў капіталізму, ён адлюстроўваецца на старонках кіруючых органаў буржуазнага друку.

«Усё разьвіцьцё падзей прышло да мёртвага пункту. Мэтады гаспадарчага сужыцьця народаў, якія ўжываліся, праваліліся. Сьвет перажывае структурны крызіс, роўнага якому ня ведае гаспадарчая гісторыя апошніх некалькіх дзесяткаў год, а бадай навет і апошніх стагодзьдзяў»—

так заўважае кіруючы орган польскага фашызму. Як-бы непарокам газэта пілсудчыкоўскай зграі гаворыць аб тым, што крызіс — структурны, што гутарка ідзе аб нейкім павароце, які адбываецца ў гісторыі сусьветнай эканомікі.

«У Амэрыцы нядаўна «праспэрыці» прэзыдэнта Гувэра ператварылася ў нябывалае пакаранньне, якога ня памятаюць ня толькі самыя старыя людзі, але наогул ніхто не памятае, бо такой катастрофы яшчэ ня было. На працягу некалькіх месяцаў капіталы 3.000 амэрыканскіх банкаў зачынілі вокны сваіх кас. Гандаль налічвае страты на дзесяткі мільярдаў даляраў. Як пляма, расьце беспрацоўе. Мінулы год зьявіўся гураганам перад якім уся чалавечая мудрасьць аказалася зусім бясьсільнай».

Гэтыя словы належаць аднаму з заможных карэспандэнтаў польскай буржуазнай газэты «Ілюстраваны Кур'ер Поземны». У гурагане крызісу разьлялася дашчэнту ўся торыя «росквіту», якая была на працягу поўнага часу сьцягам усяго сусьветнага капіталізму і яго лейтэнантаў — сацыял-фашысцкіх правадыроў. Гэты-ж сьцяг процістаўляўся сьцягу Саветаў. Гэты-ж «усеагульны росквіт» Амэрыкі ставіўся буржуазіяй і II Інтэрнацыяналам доказам выключнай жыцьцяздольнасьці капіталістычнай сыстэмы. І не прайшло 2-3 год, як самі-ж буржуазныя эканамісты, успамінаючы аб Амэрыцы, з пяўтоеным пачуцьцём трывогі за будучыню, крычаць аб катастрофе і поўнай бездапаможнасьці перад ёю ўсёй мудрасьці чалавецтва. Што-ж, трэба прызнаць, што мудрасьць капіталістычных дзяльцоў сапраўды даволі значна падгніла. Нявылечная хвароба крызісу падточвае ўвесь арганізм і худасочныя мазгі капіталізму, які разлагаецца, ня здольна стрымаць бег сваёй сыстэмы ў бяздонье поўнага банкрутства.

«Руйна сельскай гаспадаркі, прамысловасьці і гандлю, дзесяткі тысяч спыненых прадпрыемстваў, сотні тысяч людзей, пазбаўленых работы і выкінутых на вуліцу без сродкаў да жыцьця — вось малюнак, які прадстаўляе ў сучасны момант наша гаспадарчае жыцьцё».

Такую характарыстыку агульнага малюнку польскай капіталістычнай гаспадаркі дае эндэцкі орган «Газэта Варшавска».

«Сусьветная эканоміка прадстаўляе зараз суцэльную ваенную тэрыторыю, калі не сказаць — адно вялізарнае поле бойні, на якім цяжка адрозьніць прычыны і вынікі пасобных зьяўішчаў»

заўважае тая-ж газэта.

Гэта карэспандэнцкае стану сусьветнай капіталістычнай эканомікі з вайной, з барацьбой усіх супроць усіх, усё часьцей і часьцей зьяўляецца на старонках буржуазнага друку і ў выступленьнях правадыроў буржуазіі. Мноцаліні ў адным з апошніх выступленьняў адкрыта заяўляе, што капіталістычны сьвет знаходзіцца ў стане «эканамічнай вайны», што Эўропа «варочаецца да сярэднявякоўя», што падаткі імкнуцца і пістрымнае.

«Мы маем усюды крызіс сыстэмы» — гаворыць у адной са сваіх праграмных артыкулаў кракаўскі «Кур'ер». «Мы жывем у абстаноўцы ўсеагульнага крызісу давер'я — цьвердзяць усе агляды ўсіх кан'юнктурных інстытутаў буржуазнай гаспадаркі розных краін. І гэтыя галасы аб крызісе сыстэмы, аб крызісе асновы гаспадаркі ўсё часьцей прарываюцца ў гэтым хоры розных буржуазных і сацыял-фашысцкіх ацэнак разьвіцьця крызісу. А яшчэ зусім нядаўна афіцыяльныя прадстаўнікі буржуазнага сьвету з помпай сьцьвярджалі, што гутарка можа ісьці толькі аб зусім нармальнай «дэпрэсіі» аб часовых кан'юнктурных ваганьнях у агульным росьце ўсёй сыстэмы капіталістычнай гаспадаркі.

І ў гэтай абстаноўцы настроіў трывогі і пэсымізму ўсё настойлівей, усё гучней задаецца пытаньне — **а якія пэрспэктывы, куды мы ідзем, дзе выхад?**

І адказ на гэта пытаньне аб пэрспэктывах вырысоўваецца ў асьвятленьні саміх-жа буржуазных палітыкаў і эканамістаў, як зьяўлення пэсымістычны і даволі такі безнадзейны.

Вельмі тыповым для сучаснага становішча зьяўляецца выступленьне аднаго выдатнага амэрыканскага эканаміста, калі ён на пытаньне аб пэрспэктывах бліжэйшага году адказаў: «Аб пэрспэктывах на год гаварыць не бяруся... у сучасных умовах можна толькі гаварыць аб відах на бліжэйшы месяц».

Адэн з гаспадарчых кан'юнктурных інстытутаў Германіі адмовіўся нядаўна выступаць з месячнымі зводкамі аб гаспадарчым становішчы таму, што... пэрспэктывы гэтых месячных зводак, як правіла, на працягу апошняга часу перакульваюцца ўсім ходам і разьвіцьцём крызісу.

Гэтымі днямі пілсудчыкаўская газэта «Кур'ер Віленскі» ў перадавым артыкуле аб пэрспэктывах гаспадарчага жыцьця прывяла надзвычай характэрныя выказваньні на гэту тэму амэрыканскіх эканамістаў. Самыя вялікія аптымісты з іх гавораць аб магчымасьці «некаторага зьмякчэньня «крызісу» пад канец 1932 году, калі... калі «пераможа» здаровая гаспадарчая мысль». У чым гэта перамога здаровай мысьлі павінна і заключацца? Трэба спыніць... мытную вайну, у якую ўцягваюцца зараз амаль усе капіталістычныя краіны, патрэбен... сацыяльны мір, патрэбна... плянаваньне. У вогуле патрэбна тое, чаго ня можа быць пры капіталістычнай сыстэме. І калі пры ўсіх гэтых беспрадметных марах магчыма некаторае зьмякчэньне толькі к 1932 году, дык можна зразумець, як сапраўды безнадзейны ўсе гэтыя гаданьні буржуазных палітыкаў і эканамістаў на кафейнай гушчы.

«Няма ніякіх адзнак за тое, каб у бліжэйшы час пры сучасным стане рэчаў крызіс мог быць пераможаны», — заяўляе перадавы артыкул «Газэты Варшавскай»:

«Трэці акт яшчэ не наступіў. Драма сусьветных фінансаў ня скончана. Праблема толькі пастаўлена, але да гэтага часу ня вырашана. Мы яшчэ сапраўды далёкі ад фінану».

Такі прагноз буржуазных палітыкаў аб будучыні капіталістычнай эканомікі. Трывожная заява аб чаканьні «трэцяга акту» характэрна для настрояў усёй буржуазнай прэсы. Вядома, буржуазія старанна абыходзіць моўчкі зьмест гэтага трэцяга акту з пункту гледжаньня растучых сіл рэвалюцыі. Але аднаго ўтаіць яна ня можа — гэта сумнай ацэнкі пэрспэктыў гаспадарчага разьвіцьця.

У шматлікім патоку артыкулаў, гаспадарчых ацэнак, праграмных выступленьняў правадыроў буржуазіі і сацыял-фашызму час-ад-часу прарываюцца галасы, якія вымушаны пры ўсёй сваёй нянавісьці да сьвету, які будуе сацыялізм, прызнаваць асобнае становішча СССР.

«... Асобка стаіць Расія. 1932 год знайдзе пяцігодкі. Ён будзе, такім чынам, важнейшым у яе ўнутраным жыцьці. Важна ня тое, ці супадаюць пічбовыя разультаты з плянам. Важна тое, які будзе прынцыповы рэзультат—ці ідзе гаспадарчае жыцьцё Расіі па лініі зыходзячай, або па лініі ўзыходзячай. З таго, што мы ўжо ведаем, можна зрабіць вывад, што трэба адкінуць старыя погляды на ўнутраныя адносіны ў Расіі. Нэйўным зьяўляецца меркаваньне, што бальшавізм загіне і вернецца стары парадак. Сёньня відаць, што старая Расія загінула беззваротна»...

Гэта выступленьне належыць органу польскай эндэцыі, якую, зразумела, нельга падазраваць у якіх-бы там ні было сымпатыях да сацыялістычнай сыстэмы гаспадаркі.

Але іменна таму, што «асобна стаіць Расія», іменна таму, што яе гаспадарчае жыцьцё ідзе па лініі ўзыходзячай, даказваючы пры гэтым усе перавагі сацыялістычнай сыстэмы перад капіталістычнай, іменна таму буржуазны сьвет шукае і будзе шукаць у зьнішчэньні гэтай сыстэмы выхаду са сваіх уласных супярэчнасьцяй і свайго ўласнага крызісу.

Клясавыя супярэчнасьці абвастраюцца з вялікай шпаркасьцю ўнутры капіталістычных краін. «Беспрацоўе высоўвае на першы плян рад сацыяльных праблем»,—трывожна піша адна з польскіх газэт. У чым сутнасьць гэтых сацыяльных праблем — нам, зразумела, ясна. Гутарка ідзе аб тым пістрыманым нарастаньні рэвалюцыйнага руху, які адбываецца зараз ва ўсіх краінах капіталістычнага сьвету і перш за ўсё **ў Германіі і Польшчы.**

З усёй палітыкай капіталізму цесна зьвязана яго палітыка падрыхтоўкі новых войнаў і перш за ўсё вайны супроць Савецкага Саюзу. Увесь буржуазны сьвет ахоплен, ня гледзячы на востры эканамічны крызіс, ліхаманкай узбраеньняў. Адна з польскіх газэт вельмі, што на **ўзбраеньне кожны дзень траціцца ў сьвеце каля 10 мільёнаў даляраў.** Гэтыя скромныя вылічэньні далёкі, зразумела, ад сапраўдных расходаў буржуазных урадаў на справу падрыхтоўкі вайны. Але і гэта лічба характэрна ў абстаноўцы, калі каля 40 мільёнаў людзей памірае ад адсутнасьці работы і хлеба.

Вайна японскага імпэрыялізму супроць Кітаю на сутнасьці падтрымліваецца сусьветным імпэрыялізмам, хаця пяўхільна выклікае ў яго ўласным лагеры абвастраньне ўсіх супярэчнасьцяй. Вайна гэта падтрымана таму, што распаўсюджана, як уступны акт да непасрэднай падрыхтоўкі ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР, як спроба ўзброенага задушэньня ўзрастаючых сіл Кітайскай рэвалюцыі.

Адэн з польскіх фашысцкіх палітыкаў — Мацкевіч, які адзначаецца тым, што часта на старонках сваёй газэты выбухае сапраўдныя замысы сваіх панаў, у нерэдкім артыкуле, прысьвечаным новагодніх пэрспэктывах, піша:

«... К новаму году мы маем вайну. Ня будзем праклінаць яе. Пераможны рух савецтызму ў Азіі стварае і для нас вялізарную небясьпеку... Нашы сымпатыі на баку Японіі. Ня будзем праклінаць гэтай вайны, якая затрымлівае пераможны рух бальшавізму. Нашы апаскі прыходзяць зусім з іншага боку. Мы баімся, што палітыка Японіі на Далёкім Усходзе будзе больш вузкай, чым шырокай, больш блізарукай, чым разьлічваючай на далёкую будучыню».

Невыпадкова, зразумела, гэта адкрытасьць ідзе побач са зьвярынай нашавісьцю ў адносінах да рэвалюцыйнага руху Кітаю. Віленскае «Слово» піша:

«Гэта найвялікшая краіна ў радзе частак сваёй тэрыторыі цалкам збальшавізавана... Некаторыя тэрыторыі Кітаю жывуць ужо пры бальшавіцкім ладзе. Там існуюць нават натэгорыі, якія нагадваюць рускіх лішэнцаў».

Вось чаго баіцца пан Мацкевіч. Пераможны рух бальшавізму, магутны рост сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, саветызацыя Кітаю, шпаркае нарастаньне сіл рэвалюцыйнага руху ў сваіх уласных краінах — вось крыніца таго, чаму Мацкевіч заклікае не праклінаць вайну, а стаці зусім адкрыта на бок японскага імпэрыялізму.

Капіталістычны сьвет ахоплен трывогай у сувязі са змрочнымі пэрспэктывамі эканамічнага разьвіцьця, бо гэты ўсеагульны заняпад фэе побач з ростам сацыялізму ў СССР і ростам сіл рэвалюцыі на Захадзе.

У гэтых адносінах вельмі тыповым зьяўляецца заключны акорд новагодняга артыкулу таго-ж Мацкевіча.

«Няхай старая, багатая сваім мінулым і культурай Эўропа, няхай гэта пані нашай зямной кулі з вачыма, прыгожымі як Флёрэнцыя і Парыж, няхай яна не заплюшчае гэтых вачэй на небясьпекі, якія ёй пагражаюць, бо яна страціць сваё значэньне, як страцілі ўжо сьветла-срэбраны. Пецярбург і блакітны прыгожы Стамбул».

Вось чаго баіцца буржуазная Эўропа. Страціць сваё значэньне г. зн. кінуць быць тым, чым яна ёсьць зараз, г. зн. упасьці пад ударамі пераможнай рэвалюцыі, вось чаго больш за ўсё баіцца кіруючая буржуазія.

Як бачым, варта зазірнуць у крыніцы буржуазнага нахаджэньня для таго, каб атрымаць ня дрэнную ілюстрацыю да тэй асноўнай характарыстыкі ўсяго сусьветнага становішча, якое жаецца нашай партыяй. **Два шляхі, два сьветы і два вынікі**—вось асноўны сэнс гэтай ацэнкі. «Шлях капіталізму — шлях крызісу, шлях гаспадарчага заняпаду і выключных труднасьцяй для народных мас. Шлях сацыялізму — шлях росту, шлях гаспадарчага ўздыму і карэннага паляпшэньня гаспадарчага становішча шырокіх мас гораду і вёскі».

Р. Шэлін.

Польскі фашызм дэманструе свае „дасягненьні"

Матарызацыя арміі за кошт салдацкіх пайкоў

ВАРШАВА, 19. На пасяджэньні бюджэтнай камісіі сойму абмяркоўваўся праект бюджэту **вайсковага міністэрства на 1932-33 год.**

Таварыш вайсковага міністра — генэрал **Складкоўскі** прадэманстраваў новыя ўзоры ўзбраеньня і абмундзіраваньня, уведзеныя ў польскай арміі. Пасяджэньне прайшло пад знакам **поўнага адзінства** польскіх буржуазных партый, уключаючы ППС, па пытаньнях узбраеньня.

Дакладчык — дэпутат урадавага блёку Пяпякевіч—падкрэсьліваў, што фармальна агульны разьмер афіцыяльнага бюджэту вайсковага міністэрства застаўся прыблізна на ўзроўні мінулага году, аднак, рэальнае значэньне бюджэту будзе далёка большае ў сувязі са значным паданьнем цэн. Так, эканомія ў расходах на харчаваньне ў суме 44,3 млн. злотых павялічыць затраты на ваенную маемасьць (ўзбраеньні). Дакладчык адзначыў, што бюджэт складзен **пад знакам матарызацыі польскай арміі і снабжэньня яе браніраванымі гарматамі.**

Закранаючы пытаньне аб устаноўленай кантролю над узбраеньнямі, дакладчык заявіў: «У інтарэсах нашай бясьпечнасьці мы ня можам згадзіцца на такі кантроль, які зьвязвае дзяржавы, дае ісціне дзяржаўны лад, падобны нашаму, і які (лад) быў-бы, аднак, ілюзорным для дзяржаў, дзе існуе другі лад».

Новыя ахвяры фашысцкага правасудзьдзя

ВАРШАВА, 21. Ваенна-палявы суд у **Луцку** прыгаварыў да кары сьмерцю сялян вёскі Дамброва — 16-**гадовага Алеся Грэзьдзеля** і яго брата **Тэафіля — 24 год.**

Ваенна-палявы суд у **Баранавічах** прыгаварыў да кары сьмерцю жыхара гораду **Стоўбцы Алеся Морду.**

Ваенна-палявы суд у **Пінску** прыгаварыў да кары сьмерцю **Браніслава Ягела і Яна Вісьнеўскага.** Усе прыгаворы «ўгрунтоўваюцца» на абвінавачаньнях у «шпіянажы». (ТАСС).

Працэс 57 рабочых у Плоцку

ВАРШАВА. У Плоцку пачаўся працэс 57 рабочых, якія абвінавачваюцца ва ўдзеле ў дэманстрацыі беспрацоўных, што адбылася 2-га лістапада мінулага году.

Засуджан на вечную катаргу

ВАРШАВА, 21. Ваенна-палявы суд у Ломжы разглядаў справу селяніна з вёскі Пароічы—**Дамброўскага.** Дамброўскага абвінавачвалі ў забойстве лясьніка. Ваенна-палявы суд прыгаварыў селяніна на **вечную катаргу.**

Бязупынны рост беспрацоўя

ВАРШАВА, 21. На 16 студзеня пасьля даных урадавай статыстыкі, колькасьць беспрацоўных складала **209.238 чалавек.** У параўнаньні з мінулым тыднем, колькасьць пазбаўленых працы павялічылася як такое ўрадовая статыстыка вырасла на 9.149 асоб.

У сапраўднасьці лічба беспрацоўных значна большая. Бёркы працы не рэгіструюць маладых рабочых, як «пятноўпатрэўных грамадзян». Не ўваходзяць у гэту лічбу таксама беспрацоўныя сельска-гаспадарчыя рабочыя і сезонныя.

Падрабязнасьці забойства рабочага Градоўскага ў Варшаве

ВАРШАВА, 22. Нядаўна ў «Зьвязьдзе» паведамлялася аб забойстве ў Варшаве на вуліцы сярод белага дня сышчыкамі рабочага **Градоўскага.** Зараз газэта «Наш пэнэлёнд» падае наступныя падрабязнасьці гэтага забойства.

— Упачы з 14-га на 15-га студзеня ў памяшканьне Градоўскага ўварваліся 3 сышчыкі і 1 паліцэйскі і пачалі вобыск. Вобыск цягнуўся каля трох гадзін, аднак, ня даў ніякіх вынікаў. Пасьля гэтага сышчыкі загадалі Градоўскаму ісьці разам з імі, прычым адзін з сышчыкаў заявіў:

«Пан пойдзе з намі... Пан назад ужо больш ня вернецца».

З Градоўскім пайшоў і яго самы малодшы—брат Рычард. Усе яны разам з паліцыяй спусьціліся ў склеп, які належыць Градоўскім, але і там пасьля пільнага вобыску таксама нічога ня знойдзена. Тут для атрыманьня «дакладу жучковых» дэфэнзыўшчыкі зьвярнуліся да выпрабавальнага мэтаду праважаньні, які ўжываўся раней царскай охранкай, а зараз сыстэматычна польскай дэфэнзывай. Іменна ў калідоры, у склепе паміж бочкамі адпекуль ўзялася пачка камуністычных адозваў.

Сышчыкі вывелі Градоўскага за браму, на вуліцу. Там Градоўскі нібы хацеў кінуцца ўцякаць і тады сышчыкі далі па ім 12 стрэлаў.

Прашыты пакалькімі кулямі, Градоўскі ўпаў на зямлю. Прыехаўшы ў хуткім часе доктар пацьвярдзіў сьмерць...

Так загінуў забіты фашысцкімі сышчыкамі сын рабочае клясы Градоўскі...

Іншыя газэты падаюць, што забіты Градоўскі быў членам левай студэнцкай арганізацыі «Жыцьцё».

**

У апошнія часы забойствы сярод белага дня на вуліцы рэвалюцыйных рабочых і сялян фашысцкімі катамі становяцца ўсё больш частымі. У барацьбе супроць рэвалюцыйнага руху фашысцкую ўладу не здавальняюць ужо карныя экспэдыцыі, ваенна-палявыя суды, расстрэлы і пыльбенцы. Фашызм прыступіў да адкрытай расправы над рэвалюцыянэрамі нават без камэдыі — суда.

Але дарэмныя спробы. Барбарскім тэрорам фашызму ня спыніць падыхоўваючай рэвалюцыйнай навалы. Барбарскія забойствы лешых сьцюў рабочае клясы і працоўнага сялянства ня толькі ня стрымаюць рэвалюцыйнай барацьбы іх, але яшчэ больш адкрыюць ім вочы на сутнасьць фашысцкай дыктатуры, яшчэ пясьней заштурхуюць іх пад сьцягамі кампартыі для апошняй рашучай барацьбы за зьвяржэньне фашысцкага ўладу — урату голаду, галечы і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі.

Жалобныя плякаты на вуліцах Варшавы

ВАРШАВА, 23. У сувязі з забойствам камуніста Градоўскага, у Варшаве расклеены жалобныя плякаты варшаўскага камітэту, які адзначае, што **Градоўскі загінуў на пасту ў барацьбе за камунізм, і заклікае да вулічных дэманстрацый на 23 студзеня.**

Анархістычная адозва выцінчана левай студэнцкай арганізацыяй.

Боязнь рабочых дэманстрацый

ВАРШАВА, 21. Польская буржуазная прэса паведамляе, што пахаваньне забітага агентамі дэфэнзывы ў Варшаве камуніста Градоўскага адбылося ноччу. Фашысцкая ўлада, баючыся рабочых дэманстрацый, пакінула пахаваньне Градоўскага ўночы. 17 студзеня, у 4 гадз. ночы цела Градоўскага ў суправаджэньні моцнага паліцэйскага атраду было перавезена на могілкі, дзе і пахавана.

Арганізаваць работу па кантрактацыі малака

Павоцле пляну на 1932 год у БССР павінна быць загатоўлена цэльнага малака 850.000 цэнт., масла — 42.000 цэнт., сыру — 14.000 цэнт.

Загатоўка малочных прадуктаў у асноўным усклядзена на **Белмалкывсаюз** і **Белкаапмалако,** а па Койданаўшчыне, як пакізальным раёне,—па Белмаслаграм.

Весткі, якія паступаюць з месц, сьвядчаць аб тым, што многія раённыя арганізацыі недаацэньваюць значэньня загатовак малочных прадуктаў для рабочага снабжэньня і нагрузкі сырцом сыраварань.

За 20 дзён студзеня плян выкананя больш, як на 5%. У некаторых раёнах наогул не прыступілі да кантрактацыі. **Жыткавіцкі** райкаапсаюз, атрымаўшы плян, прыняў яго «да справы». Загатоўкі не правоцяцца, бо малакавец знаходзіцца ў... адпачынку. Мясцовыя арганізацыі гэтай справай ня цікавяцца. Такі-ж малюнак і па Старадарожскім раёне, дзе райсаюз і райкаапсаюз не праяўляюць ніякай зацікаўленасьці да арганізацыі загатовак малака. Да 5 студзеня пляны да многіх сельсаветаў нават ня былі даведзены. **У Барысаўскім** раёне райкаапсаюз спусьціў пляны без папярэдняга зацьвярджэньня прозьбітымам РВК і без дакладнага ўстанаўленьня нормы загатовак па кожным сельсавеце. **У Бяльніцкім** райкаапсаюзе плян кантрактацыі... згублены.

Недапушчальна слаба паступае малако па цьвёрдых заданьнях.

Адначасова Белмаслаграм выявіў абураючыя факты разбазаўваньня малочных прадуктаў і праяўленьне кулацка-рваческіх тэндэнцый у некаторых калгасах і ў малочных фэрмах. Па **Рагачоўскім, Рэчыцкім, Жыткавіцкім, Тураўскім, Пятрыкоўскім, Жлобінскім раёнах** па сыстэмах сельска-гаспадарчай і спажывецкай кааперацыі разбазарана і выпана без усякіх нарадаў каля 5.000 клгр. гальянцкага сыру і 15.000 клгр. масла і малака.

Раёнабы, не рэагуючы на гэтыя злачынныя дзеяньні і ня прыцягваючы вінаватых да суровай адказнасьці. Па **Пятрыкоўскім** раёне па расхоўваньне 797 клгр. масла ў райкаапсаюзе наогул не аказалася апраўдальных дакумантаў.

У асобных калгасах у гэтым пытаньні праяўляюцца рвацка-спэкулянцкія тэндэнцыі. Калгас імя XI-й галавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, Жыткавіцкага раёну, замест здачы дзяржаве 70% валавога ўлову малака, здаў толькі 7%, а астачу разбазарыў на месцы; калгас імя Сталіна, Рэчыцкага раёну, здаў—27,1%, калгас імя Чарвякова—27,2%.

Самацёк, пагуранньне кулацка-рвацкім настроям, адсутнасьць арганізацыйна-масавай работы ў радзе месц—вось прычыны гапебнага адставаньня ў кантрактацыі і загатоўках малака. Гэта адставаньне выклікала спыненьне і згортваньне работы пасобных малочных заводаў.

Пляны загатовак малака рэальныя. Аб гэтым сьведчыць практыка райкаапсаюзаў Брагінскага, Бялынічскага, Заслаўскага, Капыльскага, Лоеўскага, Слуцкага, Старобінскага раёнаў, якія выканалі свае пляны.

Загатоўкам малочнай прадукцыі павінен быць плян поўны хоп. Гэта можа быць дасягнута шляхам неадкладнай ліквідацыі самацёку арганізацыі загатовак, у першую чаргу па лініі загатоўчых арганізацый і райсаюзаў, бязьлітаснай барацьбы з разбазаваньнем малака, абгаварэньня даганяроў па пленумах сельсаветаў, схопах калгасьнікаў і вясковага актыву большага напіску на кулацка-замежныя гаспадаркі.

Загатоўкі малака павінны быць пасна ўвязаны з мэханізацыяй, якія праводзяцца па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, па разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі і інш.

І. М. Н.

Паведамленьні

— 24 студзеня, у 6 гадз. веч., у памяшк. ЦКК-НК РСІ Беларусі (Савецкая, 55, 1-шы паверх) у бюро скаргаў адбудзецца парада старшынь пастоў бюро скаргаў прадпрыемстваў г. Менску. Яўка старшынь пастоў бюро скаргаў і членаў абавязкова. Запрашаюцца трамадзкія інспэктары, «ЛК» і рабкоры.

— Пастановай сакратарыяту ЦК КП(б)Б, у якасьці ўпаўнаважаных па ўзмацненьні работы па загатоўцы і вывазцы лесу накіроўваюцца наступныя т. т.: Сукала